

ГАЛОЎНАЕ ДЛЯ ЭКСКУРСАВОДА — ФАНТАЗІЯ? 5

АДКРЫЦЦІ ФОРУМУ РЭГІЁНАЎ



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

12 КАСТРЫЧНІКА 2018 г.
ПЯТНІЦА
№ 197 (28813)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TVПРАГРАМА

## ЛІЧБА ДНЯ

**Амаль 9,6 тысячы**

*крэдытных дагавораў заключана з пачатку года па Указе № 240 аб адрасным субсідаванні будаўніцтва жылля. Па стане на 4 кастрычніка, банкі заключылі 9 574 крэдытныя дагаворы на суму Br493,2 млн. Пры будаўніцтве ўжо асвоена каля Br380 млн, усяго ж сёлета плануецца асвоіць Br592 млн. Крэдытныя рэсурсы выдаюць адразу шэсць беларускіх банкаў. Цяпер з прыцягненнем адрасных субсідый вядзецца будаўніцтва 114 дамоў. Больш за ўсё іх у Магілёўскай вобласці (29). Усяго ж на гэты год запланавана ўвесці 209 такіх дамоў. Большая частка кватэр выдзяляецца шматдзетным сем'ям.*

# ГРЫБНЫ ПАРОМ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Суседзі — жыхары пасёлка Парычы Светлагорскага раёна Уладзімір КАЗЛОЎСКІ і Галіна БРУХАНАВА — вяртаюцца з грыбоў на пароме па рацэ Бярэзіне.**

## КОРАТКА

- **Сярод шматдзетных ардэнаносных маці Мінска з кожным годам усё больш жанчын, якія працуюць.**
- Кампанія Singapore Airlines аднаўляе самы працяглы ў свеце авіярэйс. Працягласць палёту Сінгапур — Нью-Ёрк на адлегласць звыш 15 тысяч кіламетраў складзе 18 гадзін 45 хвілін.
- **Карпаратыўны фільм «Гонка кантынентаў» кінапраекта «БелАЗ 70» заваяваў дзве ўзнагароды міжнароднага фестывалю The Cannes Corporate Media & TV Awards.**



- Беларускі дзюдаіст Арцём Коласаў стаў двойчы чэмпіёнам юнацкіх Алімпійскіх гульняў у Буэнас-Айрэсе, а беларуска Анастасія Шкурдай там жа заваявала «серабро» ў плаванні на 50 метраў батэрфляем.

Фінансавы выдатнік

## У ГЭТАЙ «ПАВУЦІНЕ» КАМЕРЦЫЯ НЕ ЗАГІНЕ

**Эксперты ўпэўнены, што ў сегменце электроннай камерцыі ў нас яшчэ няма ўстойлівых брэндаў, хоць сітуацыя і пачала мяняцца ў лепшы бок**

**Па даных Гандлёвага рэестра Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, у нашай краіне 18 056 інтэрнэт-крам. У гэтым годзе МАРГ увёў спрошчаную сістэму падаткаабкладання для інтэрнэт-гандляроў. Што яшчэ на рынку электроннай камерцыі адбылося сёлета, мы запыталіся ў эксперта рынку — дырэктара правайдара электронных плацяжоў Assist Belarus Вячаслава СЕНІНА.**

***— У інтэрнэт-гандлі пераважаюць безнаяўныя плацяжы або вялікая доля ўсё ж такі за «кэшам»?***

— Калі ў звычайных крамах за апошні час удалося дамагчыся добрых вынікаў па пераходзе на безнаяўную аплату, то парадаксальна, але факт: у электроннай камерцыі каля 56 % пакупнікоў усё яшчэ аплачваюць заказы наяўнымі пры дастаўцы. Праўда, гэта на 8 % менш, чым годам раней, але ўсё ж... Сёння банкаўскай карткай пры аплаце карыстаюцца 12 % пакупнікоў і гэта на 36 % больш, чым у мінулым годзе. І правільна робіць: безнаяўны від аплаты надзейней абараняе правы спажыўца, таму што выразна прасочваецца шлях грошай ад спажыўца да суб'екта.

Як паказвае цяперашні вопыт, далёка не ўвесь гандаль бачыць прасоўванне бізнесу ў інтэрнэт-камерцыю. Гэтым у асноўным займаюцца буйныя сеткі. Між тым замежны вопыт сведчыць пра тое, што гэта выгадная і перспектыўная ніша для прадаўцоў. Па даных Гандлёвага рэестра, на 1 ліпеня гэтага года колькасць інтэрнэт-крам перавысіла 17 тысяч, іх прырост з пачатку года склаў 10 %.

СТАР. 2

На дарозе

## ДЗЕНЬ КАРАЦЕЙШЫ — АВАРЫЙ БОЛЬШ

**Апошнім часам узрасла колькасць ДТЗ на дарогах краіны. Узнікаюць пытанні наконт таго, з чым гэта звязана і якія прымаць меры для скарачэння колькасці аварыйных сітуацый.**

Як расказала **старшы інспектар па асаблівых даручэннях УДАІ МУС Ганна БАНАДЫК,** за верасень адзначана 308 дарожных здарэнняў. У іх загінулі 52 чалавекі, 347 атрымалі траўмы. З удзелам пешаходаў за той жа перыяд было зафіксавана 70 аварый, прычым 37 аварый адбыліся па віне саміх пешаходаў. У гэтых ДТЗ загінулі сем чалавек і атрымалі раненне 32. Выпадкаў наезду на веласіпедыстаў адзначана 38, адзін — на конны транспарт.

СТАР. 4



ISSN 1990 - 763X

# ...КАМЕРЦЫЯ НЕ ЗАГІНЕ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

***— Большасць інтэрнэт-крам — каля 51 % — належаць індывідуальным прадпрымальнікам...***

— Гэта так. Іх агульны тавараабарот за 2017 год склаў 3,4 % у агульным аб'ёме рознічнага тавараабароту. У той час як дзяржава рэгулюе і стымулюе павышэнне долі безнаяўных плацяжоў у звычайных крамах, буйны рытэйл не зацікаўлены ў інтэрнэт-краме выкарыстоўваць выключна «бязнал». Як толькі абодва бакі — і дзяржава, і рытэйлер — будуць працаваць разам, у нас з'явіцца яшчэ адзін перспектыўны канал для нарошчвання долі безнаяўных плацяжоў у краіне.

***— Хто часцей за ўсё карыстаецца паслугамі інтэрнэт-крам? Якія праблемы сёння існуюць у такім гандлі?***

— Ключавым пакупніком у інтэрнэт-крамах з'яўляецца сярэдні клас. Больш за 50 % — людзі з вышэйшай адукацыяй. У сярэднім такія пакупнікі маладзейшыя, чым усе карыстальнікі інтэрнэту, і ўжо тым больш, чым усё насельніцтва краіны. Палова з іх знаходзіцца ва ўзроставым дыяпазоне ад 25 да 40 гадоў. Звыш 53 % такіх спажыўцоў пражывае ў Мінску, на астатнія абласныя гарады прыходзіцца не больш чым па 5 % пакупнікоў.

Як і на суседніх рынках, беларусы больш актыўна купляюць электроніку, бытавую тэхніку, камп'ютары і камплектуючыя. Дык вось, менавіта катэгорыю гэтых тавараў набывалі больш за 70 % усіх пакупнікоў. На другім месцы знаходзяцца адзенне, абутак і аксесуары. Вопыт куплі такіх тавараў мае больш



за трэціну ўсіх беларускіх кліентаў інтэрнэт-крам. Істотным адрозненнем нашага рынку ад рынкаў суседніх краін з'яўляецца высокая доля пакупнікоў, якія набываюць білеты на культурныя мерапрыемствы — у кіно, тэатры, на канцэрты. Таксама цікавым стаў той факт, што «тавары для прыгажосці» абагналі тэхніку, але саступілі таварам для дома.

***— Плюсы і мінусы гандлю праз глабальную «павуціну»?***

— Больш за палову кліентаў інтэрнэт-крам выбіраюць такі метад шопінгу з-за выгады. Таксама адзначаюць, што, карыстаючыся такім спосабам куплі, не трэба нікуды ісці, ды і асартымент у такіх крамах значна большы. Галоўны сакрэт паспяховасці інтэрнэт-крамы — гэта магчымасць даць пакупнікам больш выбару і кругласутачная работа.

Негатоўнасць насельніцтва рабіць пакупкі ў інтэрнэце тлумачыцца іх сэрвісам. Па меры росту якасці і колькасці крам можна будзе бачыць пастаянны і планамерны рост інтэрнэт-гандлю ў краіне. У цэлым рынак інтэрнэт-гандлю ў Беларусі сёння праходзіць стадыю актыўнага развіцця. Пакупнікі ўсё часцей наведваюць інтэрнэт-крамы з мабільных прылад, і таму прывабнасць мабільнай версіі сайта мае вялікае значэнне.

***— Канкурэнцыя ў сеціве іграе не апошнюю ролю?***

— Галоўным трэндам з'яўляецца мультыканальнасць — мноства розных пляцовак і прылад, пры дапамозе якіх ажыццяўляецца продаж. Не менш важным для такіх крам з'яўляецца брэндынг запамінальнасці. Толькі нешматлікія з беларускіх пакупнікоў, напрыклад, могуць успомніць, у якой менавіта краме яны набылі сваю апошнюю анлайн-пакупку. У нашай краіне на сённяшні дзень у сегменце электроннай камерцыі няма ўстойлівых брэндаў, хоць сітуацыя і пачала мяняцца ў лепшы бок. Стварэнне гандлёвай маркі дазваляе прадаўцам утрымліваць кліентаў, што значна менш затратна, чым прыцягваць новых.

Паколькі канкурэнцыя на беларускім рынку e-commerce ўзрастае даволі хутка, у тым ліку за кошт замежных прадстаўнікоў, можна чакаць энергічную адаптацыю інтэрнэт-гандляроў да сусветных стандартаў у барацьбе за пакупнікоў. У будучыні чакаецца, што ў сетку выйдуць буйныя афлайнавыя гульцы, аднак і невялікія крамы будуць упэўнена займаць там сваю нішу. Мяркую, што павысіцца якасць абслугоўвання ў інтэрнэт-крамах. Інтэрнэт дазволіць пашырыць геаграфію продажаў. З часам вырашыцца пытанне з лагістыкай, паколькі поспех многіх бізнесаў будзе залежаць ад наладжанай схемы дастаўкі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## РАСКАЗАЦЬ ПРА ТОЕ, ШТО ХВАЛЮЕ

**Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі па ўсёй Беларусі пройдуць у гэтую суботу, 13 кастрычніка. На сувязь з насельніцтвам выйдуць кіраўнікі ў рэгіёнах і Мінгарвыканкаме. Галоўны вынік такога дыялогу — аператыўнае вырашэнне надзённых пытанняў. Тэлефонныя лініі з 9.00 да 12.00 правядуць:**

першы намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Валерый Васілевіч РАБКАВЕЦ. Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Пятровіч ПЕНІН. Тэл. 8 021 222 22 22;

кіраўнік спраў ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ. Тэл. 8 023 233 12 37;

першы намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Іван Алейзавіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Руслан Віктаравіч ПАРХАМОВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Мікалай Міхайлавіч РАГАШЧУК. Тэл. 8 017 500 41 60;

першы намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Фёдар Віктаравіч РЫМАШЭЎСКІ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Узаемны інтарэс

## У цэнтры ўвагі — беларуская дыяспара

**Белдзяржуніверсітэт і МДУ адкрыюць сумесныя магістратуры. Пратакол аб заснаванні сумесных магістарскіх праграм БДУ і МДУ імя М. В. Ламаносава падпісаны паміж дзвюма ВНУ. Подпісы пад дакументам паставілі кіраўнікі ўніверсітэтаў прафесар Андрэй Кароль і акадэмік Віктар Садоўнічы.**

Пратакол прадугледжвае ўмацаванне і пашырэнне двухбаковага шматвектарнага супрацоўніцтва беларускай і расійскай ВНУ, а таксама сумесную падрыхтоўку магістрантаў з атрыманнем пасля заканчэння навучання двух дыпломаў: БДУ і МДУ імя М. В. Ламаносава.

Першай сумеснай магістарскай праграмай стане «Гісторыя беларускай дыяспары», заснаваная гістарычнымі факультэтамі БДУ і МДУ. Адкрыццё магістратуры па дадзенай спецыяльнасці стала вынікам плённага супрацоўніцтва дзвюх ВНУ, а таксама вынікам рэалізацыі на гістфаку МДУ цэласнага падыходу да вывучэння гісторыі беларускага народа. У расійскім універсітэце вядзецца падрыхтоўка студэнтаў па спецыялізацыі «Гісторыя Беларусі», а з 2016 года ў яе рамках уведзена вывучэнне беларускай мовы. Мяркуецца, што навучанне па магістарскай праграме распачнецца з 1 верасня 2019 года. Уступныя экзамены можна будзе здаць у любым з універсітэтаў. Першы год вучобы пройдзе ў МДУ, а другі — у БДУ. Выпускнікі магістратуры атрымаюць два дыпломы: Белдзяржуніверсітэта і Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Вучэбная магістарская праграма распрацавана пры сумесным удзеле гісторыкаў дзвюх ВНУ і ўключае дысцыпліны агульнатэарэтычнага блока, спецкурсы і практыку. Магістранты будуць вывучаць беларускую дыяспару ў Расіі і ў свеце, асновы тэорыі і практыкі камунікацыі нацыянальна-культурных грамадскіх аб'яднанняў і іншыя аспекты. Практычныя заняткі плануецца арганізаваць на базе расійскіх і беларускіх устаноў, у ліку якіх Федэральная нацыянальна-культурная аўтаномія «Беларусы Расіі», Маскоўскі дом нацыянальнасцяў, Музей сучаснай гісторыі Расіі, Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь і іншыя. Таксама плануецца выкарыстоўваць новыя формы і метады навучання: дыстанцыйныя заняткі, круглыя сталы ў рэжыме анлайн па розных праблематыцы, анлайн-абарону навуковых работ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Падзея

## Хто паклапоціцца аб мігрантах

**У Мінску пад эгідай Міжнароднай федэрацыі таварыстваў Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца прайшоў навучальны семінар па выяўленні ахвяр гандлю людзьмі сярод мігрантаў і людзей, якія шукаюць прытулак.**

З 2000 года праваахоўнымі органамі Беларусі было выяўлена 11 543 злачынствы ў сферы барацьбы з гандлем людзьмі і іншымі звязанымі з ёй дзеяннямі, уключаючы педафілію. З 2002 года ідэнтыфікавана 5605 ахвяр гандлю людзьмі: 4973 падвергнуліся сексуальнай эксплуатацыі, 629 — працоўнай, і трое — канфіскацыі органаў.

Падчас семінара было абмеркавана, як трэба дзейнічаць пры выяўленні выпадкаў гандлю людзьмі. Якую дапамогу трэба аказваць у першую чаргу, калі трэба перанакіроўваць чалавека ў іншыя арганізацыі. Атрыманую інфармацыю трэнеры перададуць іншым трэнерам і валанцёрам у сваіх абласных арганізацыях.

**Сяргей КУЛАКОЎ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Папа Рымскі параўнаў аборт з заказным забойствам



Папа Рымскі Францыск рэзка выступіў супраць абортаў. Пра гэта паведамляе Reuters. Як адзначаецца, пантыфік звярнуўся да дзясяткаў тысяч вернікаў, якія прыйшлі на плошчу Святога Пятра ў Рыме. Ён задаў прысутным пытанне, ці з'яўляецца рашэнне «забраць» чалавечае жыццё для таго, каб вырашыць праблему, правільным. Натоўп адказаў адмоўна. «Няправільна пазбаўляць чалавека, хай і маленькага, жыцця, каб вырашыць праблему. Гэта як наймаць кілера для вырашэння праблемы», — сказаў Папа. Раней пантыфік назваў секс «дарам Божым».

### Азіяцкія біржы абваліліся ўслед за ЗША



Прамысловы індэкс Dow Jones рэзка знізіўся на 3,15 працэнта на выніках сесіі на Нью-Ёркскай фондавай біржы. Гэта самая горшая дынаміка з лютага гэтага года. Абвал у ЗША справакаваў падзенне на азіяцкіх гандлёвых пляцоўках. Як заўважаюць эксперты, сітуацыя развіваецца па сцэнарыі крызіснага 1998 года. Індэкс S&P 500, які ўключае 500 самых буйных кампаній рынку ЗША, знізіўся на 94,66 пункта (3,29 працэнта) і апынуўся на адзнацы 2785,68 пункта. Індэкс электроннай біржы NASDAQ знізіўся на 315,97 пункта (4,08 працэнта) — да 7422,05 пункта. Па выніках сесіі ўпалі ў цане акцыі цэлага шэрагу тэхналагічных кампаній. У прыватнасці, Twitter — на 8,47 працэнта, Netflix — на 8,38, Apple — на 4,63, Intel — на 3,76 працэнта. Асноўнай прычынай спаду, мяркуюць аналітыкі, з'яўляецца павышэнне даходнасці дзяржаблігацый ЗША. Павышэнне базавай стаўкі Федэральнай рэзервовай сістэмы разам з прагнозамі далейшага павышэння ставак і даволі жорсткай рыторыкай з боку чыноўнікаў ФРС прывяло да пераацэнкі чаканняў інвестараў, шмат у чым справакаваўшы рэзкі рух па даходнасці амерыканскіх дзяржаблігацый. Акрамя ўзмацнення жорсткасці манетарных умоў, сур'ёзным негатыўным фактарам для амерыканскага рынку з'яўляецца пагроза супрацьстаяння ЗША з Кітаем, якое можа зацягнуцца на 10—20 гадоў. А вось прэзідэнт ЗША Дональд Трамп на фоне зніжэння прамысловага індэкса Dow Jones зрабіў рэзкую заяву аб тым, што Федэральная рэзервовая сістэма, якая выконвае ролю цэнтрабанка, «звар'яцела» і праводзіць занадта жорсткую палітыку.

### Нурмагамедаў будзе ўдастоены звання «Народны герой Дагестана»




Дзейны чэмпіён Абсалютнага байцоўскага чэмпіянату ў лёгкай вазе расіянін Хабіб Нурмагамедаў будзе ўдастоены звання «Народны герой Дагестана» пасля паспяховай абароны тытула чэмпіёна ў баі супраць ірландца Конара Макгрэгара. «Узнагарода ўжо ўляе сабой залатую зорку з арлом, — прыводзіць словы прадстаўніка грамадскага руху «Родны Дагестан» партал Спорт24.Ru. — Час і месца ўзнагароджвання будуць абмеркаваны з самім Хабібам». Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін сустрэўся з чэмпіёнам UFC у лёгкай вазе. Кіраўнік Расійскай дзяржавы павіншаваў спартсмена з перамогай над ірландскім байцом, паведамляе «РІА «Навіны». Сустрэча адбылася пасля форуму «Расія — спартыўная дзяржава». У ёй таксама прымаў удзел бацька расійскага байца. Пуцін павіншаваў чэмпіёна UFC з перамогай над ірландцам і папрасіў яго бацьку не караць спартсмена за скандальную выхадку пасля бою.

## «БЕЛАВІЯ» ЗАПУСКАЕ ПРАМЫ РЭЙС У КІШЫНЁЎ

**«Авіякампанія «Белавія» адкрыла продаж білетаў па новым маршруце Мінск — Кішынёў — Мінск.**

Рэгулярныя палёты ў Міжнародны аэрапорт Кішынёў авіякампанія плануе пачаць з 30 кастрычніка. Рэйсы ў сталіцу Рэспублікі Малдова будуць ажыццяўляцца пяць разоў на тыдзень. Вылеты з Мінска — у 13.00 па аўторках, чацвяргах і нядзелях, у 8.00 — па панядзелках і пятніцах. З Кішынёва самалёты будуць вылятаць у 14.05 па аўторках, чацвяргах і нядзелях і ў 9.05 па панядзелках і пятніцах, а прыбываць у Нацыянальны аэрапорт Мінск у 16.30 і 11.30 адпаведна. Час палёту зойме прыкладна паўтары гадзіны. Кошт палёту ў адзін бок — ад €83, ад €153 — туды-назад. Плануецца, што палёты будуць ажыццяўляцца на самалётах тыпу Embraer 175 умяшчальнасцю 64 пасажыры ў эканом-класе і 12 — бізнес-класе.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Надвор'е

# Цёпла і суха

## На выхадныя сіноптыкі абяцаюць да 20 цяпла

**У сярэдзіне тыдня тэрыторыя краіны апынулася пад уплывам шырокага антыцыклону, які будзе вызначаць надвор'е ў гэтыя выхадныя дні і ў пачатку наступнага тыдня, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Таму чакаецца не па-асенняму камфортнае цёплае надвор'е з тэмпературным фонам на 3—5 градусаў вышэйшым за кліматычную норму. Будзе ў асноўным без ападкаў, у начныя і ранішнія гадзіны месцамі не абыдзецца без туманаў. Сёння будзе без ападкаў. Максімальная тэмпература паветра складзе 13—19 цяпла. У суботу і нядзелю чакаецца пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай у некаторых раёнах прагназуецца туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 2 да плюс 9 градусаў, а ўдзень будзе 12—19 цяпла.

Паводле папярэдніх прагназаў айчынных сіноптыкаў, на наступным тыдні з панядзелка па сераду істотных ападкаў не чакаецца. Уначы і раніцай месцамі магчымы туманы. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—9 цяпла, удзень — ад плюс 13 градусаў да 20 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

Экалагічны конкурс

# ПРЫЗЫ АД ЯНОТАЎ

## За найлепшыя кліпы аб раздзельным зборы смецця

**Спяваць на ўроку, фатаграфавацца з сябрамі і запісваць усё гэта на відэакамеру... Такое крэатыўнае заданне ад настаўнікаў атрымалі ўвосень школьнікі Беларусі. Падчас інтэрактыўных заняткаў вучні могуць не толькі даведацца пра карысць і неабходнасць раздзельнага збору смецця, але і паўдзельнічаць у рэспубліканскім конкурсе «Героям спяваць лёгка», які арганізуе ДУ «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» (Аператар ДМР).**

Яшчэ па вясне аператар пачаў рассылаць па школах дыскі з відэаўрокам «Школа юных экаменаў». Гэты матэрыял стаў наглядным дапаможнікам настаўнікам, якія, карыстаючыся відэаматэрыялам, правялі ў школах інфармацыйную гадзіну, каб навучыць дзяцей правільнаму абыходжанню з адходамі. Некалькі такіх заняткаў у школах Гродна, Мінска і Гомеля спецыялісты прадпрыемства разам з казачным Экаменам арганізавалі сумесна з педагогамі, а ўсе юныя ўдзельнікі ўрокаў таксама сталі героямі-экаменамі.



Цяпер, пэўна, ужо цяжка знайсці школьніка, які б не ведаў гімн маленькага экамена, дзе заклікаюць ратаваць планету ад смецця. Пасля правядзення інтэрактыўнага ўрока аператар раіць школам зняць відэакліп, дзе не менш як шэсць вучняў любых класаў будуць спяваць песню экаменаў «Каб планету нам ратаваць» і паказваць, як важна збіраць адходы раздзельна.

— Раздзельны збор смецця дазваляе накіроўваць яго на далейшую перапрацоўку. А другасная сыравіна эканоміць прыродныя рэсурсы і памяншае колькасць смеццевых палігонаў. У Германіі, напрыклад, доля звароту смецця ў карысны абарот перавышае 60 %, у Францыі — 40 %, а ў Беларусі — пакуль толькі 17 %, — падзялілася **Ніна КУЛЬБЕДА, галоўны спецыяліст па інфармацыйнай рабоце ДУ «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў».** — Гэты паказчык трэба павышаць, таму наша галоўная задача — праз гульнявыя і навучальныя мерапрыемствы запэўніць дзяцей, а праз іх — і бацькоў, як важна збіраць адходы раздзельна.

Крэатыўны матэрыял да 31 кастрычніка можна даслаць на электронны адрас target99by@gmail.com разам з заяўкай на ўдзел у конкурсе. Яе можа спампаваць на сайце http://target99.by. Яшчэ адзін варыянт: запампаваць відэаролік на любы файлаабменнік і даслаць спасылку для пампавання на тую ж электронную скрыню. Відэаролік на дыску можна адправіць таксама звычайнай поштай на адрас: 220073, г. Мінск, вул. Кальварыйская, 25, пакой 200. ДУ «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» з паметкай на канверце «Мэта 99». Ад адной школы на конкурс прымаецца не больш як два кліпы.

Найлепшыя відэаролікі ўдзельнікаў размесцяць на YouTube-канале target99Belarus. Пераможцаў конкурсу з 1 па 26 лістапада вызначыць журы, якое будзе ацэньваць якасць спеваў, арыгінальнасць падачы ідэі пра карысць раздзельнага збору смецця, а таксама пераканаўчасць выканання задумкі.

Чатыры школы, якія зробяць самыя цікавыя кліпы, з 27 лістапада да 17 снежня атрымаюць падарункі: камплекты музычнага мультымедыйнага абсталявання і экалагічныя наборы для ўсіх вучняў ад персанажаў вядомых ролікаў «Наш клопат, а не янота». Галоўнаму пераможцу прыз уручыць сам супергерой Экамен.

**Ірына СІДАРОК.**

# З ДОБРЫМІ НАВІНАМІ

## Наша каманда вярнулася з Сусветнай шахматнай алімпіяды ў Батумі

**Калі казаць пра вынікі спартсменаў, то яны нядрэнныя: жаночая дружына заняла 18-е агульнакаманднае месца, мужчыны аказаліся трохі ніжэй — 30-я пазіцыя са 185 удзельнікаў.**



Фота БелТА.

Акрамя вынікаў спартсменаў, гэты турнір стаў знакавым для нашай краіны, бо менавіта там мы даведаліся, што Беларусь стане гаспадыняй Сусветнай шахматнай алімпіяды 2022 года, а **старшыня Беларускай федэрацыі шахмат Анастасія САРОКІНА** абраная віцэ-прэзідэнтам Міжнароднай федэрацыі (ФІДЭ). *«Мы дастаткова доўга ішлі да гэтага, больш за год рыхтаваліся, вялася ўнутраная работа, якая, можа быць, не адразу была бачная,* — расказвае Анастасія Віктараўна. — *Ідэя падаць заяўку на правядзенне алімпіяды з'явілася дзесьці два гады таму і была агучана Максіму Рыжанкову, які яе падтрымаў, нягледзячы на тое, што можа яна і здавалася на той момант нерэальнай. Мы не алімпійскі від спорту, але і Нацыянальны алімпійскі камітэт і Міністэрства спорту паверылі ў нас і падтрымалі, сваімі сіламі федэрацыя б ніколі не справілася».*

Каб павялічыць свае шанцы на перамогу, беларусы запрасілі ў Мінск прэзідэнцкі савет і інспекцыю Міжнароднай федэрацыі шахмат. *«Скажу шчыра, калі на ўзроўні ФІДЭ я першы раз агучыла тое, што Беларусь гатовая падаваць заяўку на правядзенне Сусветнай шахматнай алімпіяды, адзін высокапастаўлены чыноўнік спытаў: «А аэрапорт у вас там ёсць?» Таму нам давялося правесці такія масавыя мерапрыемствы, каб замежнікі сваімі вачамі ўбачылі, на што здольны Мінск, якая ў нас тэхнічная база. Па прыездзе ў Мінск стаўленне змянілася адразу, і пры падачы заяўкі мы былі ўжо ў прыярытэце»,* — адзначае Анастасія Сарокіна.

Алімпіядзе-2022 будзе папярэднічаць мужчынскі Кубак свету ў 2021 годзе і жаночы чэмпіянат свету 2020 года. А сама Сусветная алімпіяда, дарэчы, пройдзе на «Мінск-арэне». Цяперашні падобны турнір у Батумі сабраў чатыры тысячы ўдзельнікаў, з іх каля дзвюх тысяч спартсменаў, такая ж колькасць запрошаных, балельшчыкаў і афіцыйных асоб. *«Сёлета была прадстаўлена рэкордная колькасць краін — 185, мы чакаем, што ў Мінск прыедзе яшчэ больш. Цяпер у Міжнародную шахматную федэрацыю ўваходзіць 189 краін, але лік штогод расце, я спадзяюся, можа, мы і 200 краін прымем і дойдзем да пяці тысяч удзельнікаў у 2022 годзе»,* — расказвае старшыня федэрацыі.

Як краіна-гаспадыня Беларусь будзе мець права прадставіць па тры свае каманды ў кожнай дысцыпліне, таму акрамя таго, што будзе выстаўляцца асноўны склад, плануецца выставіць і маладзёжны. *«У нас вельмі добрае маладое пакаленне, плеяда маладых шахматыстаў 12—14 гадоў,* — адзначае Анастасія Сарокіна. — *Мы трэці год праводзім чэмпіянат свету па бліцы сярод кадэтаў, гэта дае добры імпульс для маладых спартсменаў».*

Плануецца, што да Сусветнай шахматнай алімпіяды 2022 года Беларусь наведае шэраг ганаровых гасцей, вядомых шахматыстаў, такіх як Анатоль Карпаў, Барыс Гельфанд і Мая Чыбурданідзэ.

Таксама Анастасія Сарокіна адзначыла, што ў Беларусі зараз назіраецца шахматны бум, акрамя дзяржаўных, адкрываюцца прыватныя школы, актыўна вядзецца праграма «Шахматы ў школе».

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Чулі?!

# Допінг змяніўся карупцыяй і дамоўнымі матчамі

## Затрыманы суддзя сустрэчы мінскага «Дынама» і піцерскага «Зеніта»

**Сусветны спорт зноў сатрасаюць буйныя скандалы, на гэты раз яны датычацца карупцыі і дамоўных матчаў. У сераду ў сямі еўрапейскіх краінах праведзена маштабная аперацыя ў рамках расследавання справы аб карупцыі ў вышэйшай футбольнай лізе Бельгіі. Былі праведзены вобыскі ў 57 аб'ектах у Бельгіі, Францыі, Люксембургу, Чарнагорыі, Сербіі, Македоніі і на Кіпры.**



Затрыманыя некалькі ўплывовых футбольных агентаў, шэраг суддзяў і прадстаўнікоў клубаў. Замежныя СМІ паведамляюць, што ў праваахоўных органаў ёсць інфармацыя аб меркаваных правапарушэннях у бельгійскім футболе — карупцыі, адмыванні грошай, арганізацыі дамоўных матчаў і фінансавых махінацыях пры пераходзе гульцоў з клуба ў клуб.

Сярод арыштаваных суддзяў Барт Вертэнтэн і Себасцьен Дэльфер'ер, арбітрам прыпісваюць удзел у дамоўных матчах. Адзначым, што Себасцьен Дэльфер'ер працаваў на матчы мінскага «Дынама» супраць «Зеніта» ў Санкт-Пецярбургу, які завяршыўся разгромам беларускай каманды, — 1:8. Таксама гэтыя суддзі абслугоўвалі еўракубкавыя гульні ўкраінскіх камандаў, напрыклад, Дэльфер'ер на мінулым тыдні быў галоўным арбітрам у матчы кіеўскіх дынамаўцаў з чэшскім «Яблонцам» (2:2).

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Фінансы

# ІНФЛЯЦЫЯ ЗА МІНУЛЫ МЕСЯЦ — 0,8 %

**Індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў верасні ў параўнанні са жніўнем склаў 100,8 %, са снежнем мінулага года — 103,7 %, паведамілі спецыялісты ў Нацыянальным статыстычным камітэце.**

Базавы індэкс спажывецкіх цэн, які выключае змяненне цэн на асобныя тавары і паслугі, якія падпадаюць пад уплыў фактараў адміністрацыйнага і сезоннага характару, у верасні ў параўнанні са жніўнем склаў 100,8 %, са снежнем 2017 года — 103,6 %.

Як адзначылі ў Белстаце, харчовыя тавары падаражэлі на 0,4 % у параўнанні са жніўнем, нехарчовыя тавары — на 1 %. Больш за ўсё ў мінулым месяцы падраслі спажывецкія цэны на паслугі — 1,3 %.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Без бар'ераў

# Дакрануцца да прыроднай прыгажосці

## Для інвалідаў па зроку будзе створаны сэнсарны маршрут па лесе

**Гэта міжнародны праект, у якім удзельнічае аддзяленне дзённага знаходжання інвалідаў Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ленінскага раёна Гродна. Праект «Далучэнне да прыроды» накіраваны на экалагічную асвету людзей з абмежаванымі магчымасцямі па зроку.**



Незвычайная экалагічная сцежка будуецца за 30 кіламетраў ад Гродна на тэрыторыі Рэспубліканскага ландшафтнага заказніка «Азёры». Гэта будзе маршрут, які дазволіць людзям з абмежаваным зрокам пазнаёміцца з разнастайнасцю прыроды, а галоўнае — навучыцца бяспечным паводзінам у лесе. На працягу амаль кіламетра турысты змогуць прайсці па сцежцы з пакрывам рознага віду — з пяску, гравію, травы, ігліцы. Дарога будзе абмежавана бярвёнамі. Для людзей з поўнай стратай зроку ўздоўж маршруту прымацуюць канат.

Дарэчы, праект далучае і да экалагічнай асветы. На бетонных пляцоўках размесцяцца адбіткі слядоў дзікіх жывёл, якія насяляюць заказнік. Тут з'явяцца сляды зубра, зайца, лісіцы, рысі, барсука і іншых. Між іншым, у ландшафтным заказніку зарэгістравана больш за 170 відаў наземных жывёл, разнастайная і птушыная група, сярод якой больш за дзясятак чырванакніжных. Птушыныя галасы будуць запісваца на аўдыясістэмы і выкарыстоўвацца як для распазнавання, так і для рэлаксацыі. Яшчэ адзін участак пазнаёміць турыстаў з відамі дрэў, якія яны самі змогуць вызначыць па іх сплаках і па кары.

— Гэта будзе сэнсарная сцежка, дзе чалавек з поўнай альбо частковай стратай зроку зможа памацаць усё на сваім шляху, — расказвае **кіраўнік праекта, супрацоўнік аддзялення для інвалідаў Галіна МАРОЗІК.** — Такія веды, якія высветліліся, вельмі патрэбныя, бо дапамогуць інвалідам па зроку лепш арыентавацца ў лесе, навучаць асновам бяспечных паводзінаў. Напрыклад, як пазбегнуць укусу кляшча альбо пчалы, што рабіць, калі гэта здарылася, і многае іншае.

А яшчэ ў заказніку будзе абсталяваны спецыяльны цэнтр, дзе плануецца праводзіць навучальныя заняткі. Гэту работу бяруць на сябе супрацоўнікі і студэнты факультэта біялогіі і экалогіі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, якія таксама прымаюць удзел у праекце. Для навучэнцаў падрыхтуюць адпаведную літаратуру, у тым ліку з тактыльным шрыфтам Брайля. Тыя, хто пройдзе такія заняткі, змогуць і самі надалей працягваць экалагічную асвету.

— Як паказаў маніторынг, людзям з абмежаванымі магчымасцямі па зроку патрэбны і экалагічныя веды, нейкія навыкі знаходжання на прыродзе. Напрыклад, умець адрозніць карысную ягаду ад ядавітай, добры грыб ад паганкі. Гэта дазволіць часцей выязджаць у лес і атрымліваць новыя ўражанні, — адзначыла Галіна Марозік.

Сэнсарны маршрут плануецца запусціць вясной будучага года, ён разлічаны як на дарослых наведвальнікаў, так і на дзяцей.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

### ❍ У ТЭМУ

Гатовы да рэалізацыі трансгранічны праект у рамках праграмы «Літва — Латвія — Беларусь», прызваны пашырыць даступнасць да сацыяльных паслуг. Партнёрамі праекта сталі Цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ленінскага раёна Гродна і адпаведная ўстанова ў літоўскім горадзе Друскінінкай. Беларускаму боку выдаткавана 70 тысяч еўра. На гэтыя сродкі плануецца набыць аўтамабіль для перавозу людзей з інваліднасцю, а таксама пад'ёмнік, які «крочыць» па прыступках. Для аказання такіх паслуг, як кінэзатэрапія і эргатэрапія, будуць закуплены спецыяльныя трэнажоры, якія дапамогуць палепшыць работу суставаў, а таксама праводзіць рэабілітацыю пасля інсультаў і інфарктаў.

# ДЗЕНЬ КАРАЦЕЙШЫ — АВАРЫЙ БОЛЬШ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У цэлым, заўважае Ганна Бандык, тэндэнцыі да павышэння колькасці ДТЗ не назіраецца. Наадварот, з кожным годам сітуацыя на дарогах становіцца больш бяспечнай. Калі браць такую красамоўную лічбу, як колькасць загінулых у ДТЗ, то тут адзначана зніжэнне на 6,5 працэнта.

Што ж датычыцца частых аварый у апошнія тыдні, то прамую ролю тут адыгрывае змяненне ўмоў надвор'я. Пачаўся асенне-зімовы перыяд. Святлее пазней, а цямнее, наадварот, рана. Бачнасць на дарогах пагаршаецца, асабліва, у дажджлівы час. Нярэдка бывае так, што кіроўцы не паспяваюць заўважыць нават іншы аўтамабіль, не кажучы ўжо пра цёмны сілуэт пешахода на абочыне.

І тут першараднае значэнне набывае ўважлівасць саміх кіроўцаў і пешаходаў. Для кіроўцы важна старанна правяраць тэхнічны стан аўтамабіля. У салоне павінен працаваць абагрэў, што дазваляе пазбегнуць запацявання шкла. Само сабой, павінны быць спраўныя светлавыя прыборы, «дворнікі» і тармазная сістэма. Таксама кіроўцам не варта забываць, што ўключэнне блізкага святла ва ўмовах недастатковай бачнасці дапаможа пазбегнуць самых непрыемных сітуацый.

Акрамя таго, трэба адзначыць такую дэталь, як фізічны стан чалавека. З надыходам халадоў многія пачынаюць хварэць, прымаць лекі, што адбіваецца на здольнасці чалавека належным чынам кіраваць транспартным сродкам. Садзіцца за руль хвораму наогул забаронена. Але некаторыя ігнаруюць падобныя забароны, следствам чаго можа стаць чарговае ДТЗ.

Умовы надвор'я часам даволі непрадказальна ўздзейнічаюць на паводзіны кіроўцаў. Напрыклад, увесь тыдзень было дажджліва, а затым на выхадныя стала цёпла і суха. І многія з радасці пачынаюць «лётаць», забываючы аб хуткасным рэжыме і ствараючы масу аварыйных сітуацый. Да такіх кіроўцаў хочацца звярнуцца з заклікам аб няспынным пільнасці і выкананні элементарных правілаў дарожнай бяспекі.

Што датычыцца пешаходаў, то ім трэба ў першую чаргу нагадаць пра важнасць абазначэння сябе святлоадбівальнымі элементамі — флікерамі. Праведзеныя эксперыменты даказалі, што флікер робіць пешахода на цёмнай дарозе прыкметным у святле фар на адлегласці да 400 метраў. А гэта дае кіроўцу дадатковы час на прыняцце найбольш правільнага рашэння, каб пазбегнуць наезду на пешага ўдзельніка дарожнага руху.

Размяшчаць святлоадбівальныя падвескі, павязкі, бранзалеты, значкі і іншыя элементы неабходна так, каб яны былі бачныя кіроўцу, а не закрываліся складкамі адзення, торбамі або парасонамі.

І, зразумела, пешаходы, разам з кіроўцамі, абавязаны выконваць правілы дарожнага руху. Гэта значыць, не пераходзіць вуліцу ў забароненых месцах, не дапускаць нечаканага з'яўлення на дарозе, не знаходзіцца на праезнай частцы ў стане ап'янення. Правілы гэтыя простыя і ўсім вядомыя, і няўхільнае выкананне іх, асабліва з наступленнем асенне-зімовага перыяду, дазволіць пазбегнуць непажаданых і трагічных наступстваў.

**Сяргей КУЛАКОЎ.**


**Извещение об открытом аукционе по продаже имущества ОАО «Чайка», расположенного по адресу: г. Гродно, ул. Титова, 24, 13 ноября 2018 года**

| | |
|---|---|
| Вид аукциона | Открытый |
| Предмет аукциона | Комплекс зданий, сооружений и оборудования, включающий 4 капитальные строения (здание гаражей с сауной, здание склада с гаражом и мастерской, здание мастерской, здание бензохранилища), зеленые насаждения |
| Начальная цена продажи | **571 497,60 рубля** (с учетом НДС 20 %) |
| Кадастровые номера земельных участков и размеры | 440100000001000464 площадью 0,3250 га |
| Месторасположение земельных участков | **Гродненская область, г. Гродно, ул. Титова, д. 24** |
| Продавец | **Открытое акционерное общество по химической чистке одежды и стирке белья «Чайка», г. Гродно, ул. Зернова, 6, тел. 8 (0152) 607302, 745502** |
| Имущественное право земельных участков | Право постоянного пользования |
| Сумма задатка | **17 144,93 рубля** |
| Организатор аукциона | КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», тел.: 720537, 720546 |
| Дата проведения аукциона | **13 ноября 2018 года** |
| Время проведения аукциона | 12.00 |
| Место проведения аукциона | **г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал** |
| Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 403 |
| Дата и время начала приема документов | 15 октября 2018 года, 8.00 |
| Дата и время окончания приема документов | 8 ноября 2018 года, 17.00 |

Дополнительные условия:

Площадка по адресу ул. Титова, 24 в г. Гродно включена в состав функциональной зоны «01см-п» – общественная смешанная пространственно городского ядра и центра. Возможна реконструкция под объект общественной полифункциональной застройки.

Предусмотреть организацию автомобильной парковки для указанного объекта по нормативным требованиям таблицы В. 1 Приложения В ТКП 45-3.01-116-2008 «Градостроительство. Населенные пункты. Нормы планировки и застройки».

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

– копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24AKBB30120000418104000000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», **юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов; **физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 20 дней со дня проведения аукциона.

Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**



**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении открытого аукциона**

**Лот № 1:** Право заключения договора аренды помещений общей площадью 47,8 кв. м (в т. ч. 46,7 кв. м, 0,7 кв. м, 0,4 кв. м), расположенных на первом этаже капитального строения с инв. № 700/С-15319 (здание почтамта), по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28. Право аренды предоставляется сроком на пять лет.

***Начальная цена продажи: 192,51 бел. руб. с учетом НДС***
***Сумма задатка: 19,25 бел. руб.***

| | |
|---|---|
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **Аукцион состоится 13 ноября 2018 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Последний день подачи заявок и внесения задатка: 12 ноября 2018 года до 15.00. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее чем за три дня до даты аукциона |
| **Расчетный счет для внесения задатка** | Получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X |

**Продавец:** Могилевский филиал РУП «Белпочта, УНП 700838286, г. Могилев, ул. Первомайская, 28

**Организатор аукциона:** Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, тел. +375 222 72-41-14

**Порядок проведения аукциона:** для участия в аукционе приглашаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, которые внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, своевременно подали заявление на участие в аукционе со всеми необходимыми документами, заключили с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон. Лоты продаются без условий на открытом аукционе с применением метода повышения начальной цены, с шагом пять процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. Единственный участник имеет право приобрести объект продажи по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона уплачивает затраты за организацию и проведение аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона в соответствии со счетом-фактурой. В течение 5 рабочих дней со дня подписания протокола аукциона Победитель перечисляет на расчетный счет Продавца цену продажи предмета аукциона за вычетом задатка. Задаток, внесенный для участия в аукционе Победителем аукциона, засчитывается в счет уплаты за предмет аукциона. Победитель аукциона обязан в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня оплаты предмета аукциона подписать договор аренды помещений

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: +375 44 767-65-36, +375 222 72-41-14**



Утерянное Свидетельство о государственной регистрации ОДО «БелСтрахБрокер» № 506006706 считать недействительным.




## ПАШЛІ ДУРНОГА...

Некалі ў гэтай вёсцы жыццё бруіла, як крыніца вясной: у калгасе «Шлях да камунізму» мясцовая брыгада была адной з найбуйнейшых. Але ж гэта — даўно. Цяпер тут засталіся хіба што бабулі-ўдовы, якія не хочуць з'язджаць да дзяцей, бо свая хатка як родная матка, ды некалькі хранічных выпівох.

Суседзі Іван і Яўхім не з такіх. Першы — жыве з жонкай, трымае якую-ніякую гаспадарку з коз ды курэй. У другога на падворку толькі Піначэт — вялікі дварняк і гэтакі ж злодзей. Неяк бабуля Антоля папрасіла куму, каб адзначыць свой юбілей. Паставіла на стол міску яечні з каўбасой, талерку блінцоў (астатняе было ў халадзільніку)... Выбегла з хаты кропу нарваць ды госцю сустрэць (тая ўжо ў двор заходзіла). А вярнулася і вачам не паверыла: ля стала стаяў Піначэт, міска з-пад яечні парожняя, на талерцы — апошні блін...

Але ж гісторыя мая зусім не пра сабаку і не пра Яўхіма. Іван, збіраючы грыбы, аднойчы выйшаў да старога кар'ера, пастаяў ля яго ды падумаў, што добра б сюды рыбы запусціць...

Ад акунёў і шчупакоў адмовіўся адразу (сват не параіў, бо надта пражэрлівыя). З'ездзіў у рыбгас, купіў карпаў і карасёў.

Пачуўшы пра гэта, сусед вырашыў далучыцца, таксама прыкупіў, сказаў, што ўдваіх яно ж будзе весялей і гадаваць тую рыбу, і потым вудзіць...

Карацей, суседзі, зарыбіўшы кар'ер, то паасобку, то разам хадзілі туды штодня — падкарміць, прасекчы зімою палонкі, паглядзець, што ды як, чаплю паганяць (яна стала палявáць на рыбу)...

— Трэба, мусіць, і нам ужо, — прызналі тады разводчыкі.

На другі дзень Іван, прыхапіўшы вуду, прыйшоў на кар'ер і ўбачыў, што... спазніўся: Яўхім ужо стаіць на беразе, ужо цягае карасёў, прычым спінінгам... І не толькі вялікіх, але і малых. Гэта для Піначата, маўляў.

Ну як было такое сцярпець, як не сказаць суседу, што ён — такі ж дармаед, як яго сабака!

Ды і далей слова за слова... Пасварыліся дзяды, два дні не размаўлялі.

...На трэці Іванава Дуня сабралася ў райцэнтр. Трэба, маўляў, зялёную цыбулю прадаць і яйкі, лекаў сабе прыкупіць...

— А мне — спінінг, — тут жа загадаў Іван.

Дапытвацца, што гэта і для чаго, жонка ўжо часу не мела: спехам падсунула мужу паперку і аловак, сказала:

— Напішы во тут, што табе трэба, а то забудуся.

Ужо добра слепаваты Іван дрыготкай рукой нешта крамзануў, і Дуня «пабегла» на аўтобус.

...Яйкі і цыбулю яна прадала хутка. Купіла сабе, што хацела. Паспрабавала прачытаць, што ж трэба Івану, але сама не змагла: як на тое ліха акуляры дома пакінула. Прыйшлося паказаць паперку аднаму з хлопцаў-гандляроў, але той адразу сказаў:

— Я гэтым не гандлюю. Ідзіце да Анжэлы, у той вунь кіёск.

У тым сядзела, відавочна, не Анжэла, бо амаль равесніца Дуні. І такая ж слепаватая. Не адразу прачытаўшы дзедавы крамзолі, яна спытала, які патрэбен памер?.. Каму яна гэта купляе?

— Ды муж загадаў, — адказала Дуня. — Трэба ж яго парадаваць?

Тая «не Анжэла» запытальна акругліла вочы... Але часу, каб паразмаўляць з ёй, Дуня не мела.

— Ты давай, разлічвай хутчэй, — загадала ёй, — а то я на аўтобус спазнюся.

...Па дарозе разглядваць пакупкі звычкі ў яе не было. Дастала іх з сумкі дома — і свае, і, вядома ж, мужаву.

— Што гэта?! — спытаў ён, атрымаўшы... невялічкі бліскучы пакунак.

— Тое, што ты прасіў... Што напісаў, — праз паўзу ўдакладніла жонка.

Муж тым часам разарваў упакоўку, двума пальцамі выцягнуў з яе нешта... ружовае і закрычаў:

— Я пісаў «спінінг»! Рыбу лавіць... А гэта што?

Дуня разгублена маўчала.

На выручку ёй ці не бог прыслаў паштарку Веру.

— Ой, дзядзька, дык гэта ж стрынгі, — сходу прызнала тая. — Іх цяпер маладыя дзяўчаткі носяць. Унучцы падарыце.

Але было позна: Іван ужо кінуў пакупку за Яўхімаў плот...

Адтуль і амаль адразу ж выскачыў Піначэт, на ашыйніку якога прыгожым бантам віселі ружовыя не тое шорцікі, не тое трусікі. І тым самым нагадвалі вяскоўцам старое «пашлі дурнога, за ім другога», ды мудрае «хочаш зрабіць нешта добра, — зрабі гэта сам»...

Ці хоць напішы разборліва.

**Ніна Кандрашонак,**
*г. Петрыкаў.*

## З БОЖАЙ ДАПАМОГАЙ

Багатая наша мова! Мноства ў ёй прыгожых, ёмкіх слоў! Ніколі не забудуся: прыйшла неяк з работы дамоў ды хвалюся маме, што па дарозе нарвала лекавых траў. «Гэта ж якіх?» — пытаецца яна. «Рамонкаў, — кажу, — зверабою...» «Ён панашаму не так называецца, — папраўляе мама, — ён па-нашаму — святаяннічак».

Замілавала мяне гэта слова, бо яно ж і праўда: на свята, на Яна (яно ж Купалле) прыпадае самы росквіт прыроды. Усе травы, сабраныя ў гэты час, маюць найбольшую гаючую сілу. І адна з іх так і называецца.

Ёмкасцю сваёй мне падабаецца і слова немаўля, немаўлятка, бо, пачуўшы яго, адразу разумееш, што гэта пра маленькіх, якія не маюць пакуль мовы, то-бок не могуць, не ўмеюць пакуль размаўляць. Але ж іншых яны слухаюць, пачынаюць разумець і памалу вучацца. Нават вершык гэтакі ёсць: «Первое слово ребенок сказал — «мама»... Альбо «тата» ці «дай». Але ж так не заўсёды...

У наш лучынскі калгас некалі прыехала маладая сямейная пара. Ён — ужо галоўным аграномам, яна — так званым насенняводам.

Кватэру ім далі адразу ж. І дзіцятка хутка з'явілася. Маці з ім да года ў дэкрэтным пасядзела (болей не давалі), а тады стала думаць, што ж далей рабіць, бо ні садка табе, ні блізкіх бабуль і дзядуляў... З кім пакінуць дзіця?

Прыйшлося нянькý шукаць, а паколькі ахвотных на гэтую працу было няшмат, абяцалі і добрае жалаванне, і «поўнае харчовае забеспячэнне», і падарункі да свят...

Карацей, баба Прося, «уладкаваўшыся да аграномаў на працу», можна сказаць, зроду так не жыла: гэтак не ела, не піла і не прыбіралася. То ў яе шаліноўка новая, то спадніца-сукенка...

Але ж і Светачку яна глядзела. Не толькі за дабраты: дзіцятка само па сабе было вельмі ціхмянае, спакойнае, а ўжо ж прыгожае... Кудзеркі светлыя, носічак бульбінкай, вочкі па яблычку... Ну чыста анёл! Толькі без крылцаў! На яго ж нават не залуеш — хіба што пацешышся.

Гэта вось нянька і рабіла, бо бацькам вечна часу не было: работа ў іх. І не тое каб з дзевяці да шасці, а з шасці да дзесяці. Ды не ў ціхіх кабінетах, а на палях ды лугах: аграномы за дзень на сваім матацыкле іх па некалькі разоў аб'язджалі...

Ці трэба казаць, што дамоў пасля гэтага часам вярталіся, як тыя шахцёры, — на тварах толькі вочы ды зубы блішчаць.

«Божа-божа!» — гледзячы на іх, казала тады баба Прося і адпраўляла мыцца, каб дзіця, крый бог, не спужалі.

Ну і наогул — на абед не прыехалі? Нянька: «Божа-божа...», куры ў грады залезлі — «Божа-божа...», Светачка кашу па стале размазала — таксама.

Але ж галоўнай бабінай «божа-божай» было тое, што дзіцятку пара б размаўляць, а яно, як выглядае, нават не збіраецца: гудзе нешта сваё і ніякіх там «мамаў-тат».

«З гэтым трэба нешта рабіць», — падумала нянька і таемна ад бацькоў (бацька ў камуністах хадзіў) стала чытаць над малой «Ойча наш».

Дзіця на гэта — ніякай увагі, і, адпаведна, ніякіх наступстваў. Баба Прося тады на новы ўзровень перайшла, як кажа моладзь: стала заводзіць чароўнае «Верую...».

Светачка падняла на яе блакітныя вочкі і строга сказала: «Ату!» (сціхні, маўляў).

— Дык я ж для цябе стараюся, — пакрыўдзілася бабуля. — Хачу, каб ты загаварыла хутчэй — са мною, з бацькамі...

А тут якраз і яны — лёгкія на паміне: з работы з'яўляюцца. І зноў ледзь жывыя, мурзатыя.

Светачка паглядзела на іх, цяжанька ўздыхнула і, склаўшы рукі на жывоціку, выдала:

— Бозя-бозя...

— Што?! Дачушка, што ты сказала? Калі ласачка, паўтары! — наперабой папрасілі малую ўсхваляваныя бацькі.

— Ату, — сказала ім Светачка.

І толькі назаўтра ўжо выдала і «маму», і «тату», і «бабу», і «каку», і ўсё астатняе, быццам не было ніякай маўчанкі.

...А што доўга не размаўляла, дык, можа, прадчувала, што, стаўшы настаўніцай, нават завучам школы, яшчэ нагаворыцца.

**Соф'я Кусянкова,**
*в. Лучын, Рагачоўскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

**Ад яе ж** чарговы напамін, што ўсе «вясёлыя і праўдзівыя гісторыі з жыцця чытачоў» на старонках «Звязды» не проста друкуюцца, — яны ўдзельнічаюць у конкурсе на найлепшую. Вынікі яго будуць падведзены на пачатку наступнага года. Журы — і вялікае чытацкае, і маленькае рэдакцыйнае — працуе, гісторыі пошта прыносіць...

Дасылаючы іх, калі ласка, паведамляйце свае пашпартныя даныя і — на ўсякі выпадак — нумар тэлефона для аператыўнай зваротнай сувязі.

## Неасабісты суб'ектыў

# «Мужыцкая праўда» на мове Гарацыя,



### або Чаго вы не ведалі пра Беларусь, але пра што вам раскажуць экскурсаводы

СУБОТНІ дзень абяцаў быць удалым і цікавым. Сонца, якое толькі выкацілася з-за далягляду, раскідвала свае промні па чырвона-жоўтых клёнах, зручны аўтобус шпарка каціўся па гладкай трасе, паветра за яго шыбамі, здавалася, трымцела ад роснай чысціні. Мы ехалі на экскурсію ў адзін з найстаражытнейшых нашых гарадоў, і, нягледзячы на тое, што ўсталі ўсе рана, яшчэ зацемна, у нагрэтым салоне ніхто нават не драмаў. Падарожнікі былі ўзрушаныя прыгажосцю наваколля, прыемнай кампаніяй, самім фактам паездкі. Дый, калі б хто і хацеў заснуць, наўрад ці яму б гэта ўдалося, бо экскурсавод Тамара гучным натрэніраваным голасам, ды яшчэ ўзмоцненым мікрафонам, увесь час спрабавала нам нешта распавядаць.

Менавіта «спрабавала», і ў яе не вельмі атрымлівалася. Заматаўляючы экскурсію ў буйным агенцтве, мы папярэдзілі, што група ў нас беларускамоўная, таму пажадана, каб наша падарожжа ўласна беларускай моваю і суправаджалася. Тамара нам пра гэта на самым пачатку паездкі паведаміла — пра свой намер размаўляць з намі па-беларуску. Але, як высветлілася з першых жа фраз, гэта было ёй ну вельмі няпроста. Спачатку яна збівалася на трасянку, а пасля, пры нашай маўклівай згодзе (шкада было чалавека, што мучаецца, падбіраючы словы) перайшла на больш звыклую для яе рускую.

ЗРЭШТЫ, як яна гаварыла — гэта нічога, у любым выпадку ўсе ўсё разумелі. А вось што давялося пачуць — гэта гісторыя асобная. Паўфантастычныя версіі пра ўзнікненне Мінска яшчэ можна было прыглыніць — у кожнага старога месца павінна быць свая легенда, а то й не адна. Аповед пра храмы ў Ракаве слухаўся ўжо з пэўнай доляй насцярожанасці: пра выкладзеныя факты дагэтуль ні чытаць, ні чуць не даводзілася. Паходжанне назвы Ліда ад слова «ляда» прайшло на ўра — пашыраная навуковая версія была агучана дакладна. Але супакойвацца было рана, наперадзе чакала новае адкрыццё дагэтуль невядомай старонкі нашай гісторыі. Распавядаючы пра Арыянскую акадэмію ў Іўі (арыяне — асобнае адгалінаванне пратэстантызму), Тамара, напэўна, рашыла зымправізаваць. Пачаўшы з таго, што моваю навучання ў акадэміі была латынь (што, уласна кажучы, не навіна), яна стала расказваць, што латынь хадзіла на нашай тэрыторыі яшчэ доўгі час. Спачатку падумалася: ну, паблытаў чалавек латынь (мову) з лацінкай (шрыфтам) — з кім не бывае. Але калі Тамара з упэўненасцю выдала: «Нават Кастусь Каліноўскі сваю «Мужыцкую праўду» выдаваў на латыні. І, вы ўяўляеце, яшчэ ў XIX стагоддзі гэту мову ў Беларусі разумелі нават сяляне...» — ва ўсіх, хто гэта слухаў і пачуў, твары былі прыблізна як у манахаў з вядомай карціны «Прыплылі»...

КАНЕШНЕ, можна з гэтага выпадку пасмяяцца, паўсчуваць кадну асобна ўзятую кабету за недасведчанасць. Калі б гэты выпадак быў адзінкавы. Я пасля той паездкі размаўляла са стрыечнай сястрой, якая працуе ў сталічнай гімназіі і са сваім класам часта ездзіць на розныя экскурсіі. Як правіла яны замаўляюць іх на беларускай (гімназія беларускамоўная). «Часцей за ўсё іх хапае на хвілін пятнаццаць, — расказвала Наталля. — А пасля мы самі, каб не мучыліся, прапаноўваем ім перайсці на рускую. Але ад гэтага не лягчэй — плятуць абы-што, чалавек, які хоць неяк цікавіцца гісторыяй, шмат «новага» даведваецца. Дый тыя, хто на мове шпарыць бы па напісаным, часам такія гістарычныя адкрыцці выдаюць — у дзяцей вочы на лоб ад здзіўлення лезуць. Пачулі нядаўна ад такога знаўцы, што Дзяржынск, аказваецца, заснаваў хан Кайдан. І мараль ад яго ж — вось, маўляў, ішлі на нас татары не толькі з мэтай заваяваць, але ж і добрае нешта рабілі»...

І вось з гэтых, па сутнасці, прыватных выпадкаў агульная праблемка і вымалёўваецца. Павярнуўшы нарэшце самі беларусаў тварам да Беларусі, натхніўшы іх вывучаць і адкрываць для сябе родны край, мы не стварылі (спадзяюся, пакуль што) сістэмы якаснага адбору тых людзей, якія па прафесіі сваёй павінны дапамагаць людзям вывучаць і адкрываць. У нашым грамадстве, асабліва калі ідзе размова пра моманты гістарычныя, датычныя менавіта нашай краіны, а тым больш краязнаўчыя, словы экскурсавода для многіх — першая, а можа, і адзіная крыніца ведаў. Раскажа такі вось «знаўца» пра заснаваны Кайданам Дзяржынск (раней — Койданава) ці пра «Мужыцкую праўду» на мове Гарацыя экскурсіі з нейкага прамысловага прадпрыемства — і ўсё гэта будзе ўспрынята на веру без сумнення, бо як жа не верыць, калі расказвае чалавек, які спецыяльна дзеля гэтага тут пастаўлены.

Пра гэту актуальную праблему мы гаварылі з прафесійнымі гісторыкамі падчас круглага стала, прымеркаванага да ўгодкаў знішчэння фашыстамі Хатыні. І вельмі слушна тады сказаў доктар гістарычных навук Аляксей Літвін: «Увогуле не пашкодзіла б прафесійным гісторыкам азнаёміцца з тэкстамі экскурсій, якія сёння праводзяцца. Магчыма, трэба задумацца пра тое, каб на экскурсію, асабліва па тэме Вялікай Айчыннай, выдавалася адпаведная ліцэнзія, і толькі тады чалавек меў бы права яе праводзіць...»

ЗДАЕЦЦА, настаў час сапраўды пра гэта не тое што задумацца — дзейнічаць. Бо, як паказвае гісторыя, калі да яе, гісторыі, адносіцца легкадумна, нічога добрага з гэтага не атрымліваецца.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

# ПАРТНЁР ЧАЛАВЕЧАГА ЗДАРОЎЯ

## Сучасная фармацэўтыка Нясвіжскага завода



**Распрацоўка інавацыйных прэпаратаў, якія не маюць аналагаў у свеце, трохузроўневы кантроль якасці, адпаведнасць міжнародным стандартам і пастаяннае пашырэнне асартыменту лекаў. Так працуе Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў, які ўжо 58 гадоў дбае пра здароўе беларусаў.**

Створанае ў гістарычных збудаваннях князёў Радзівілаў прадпрыемства пастаянна мадэрнізуе вытворчасць і стараецца апярэдзіць час, каб загадзя быць гатовым да іспытаў хваробамі. Цяперашняя яго прадукцыя — гэта 37 найменняў лекавых сродкаў, з улікам формаў выпуску і дазіровак тут выпрабляюць 105 відаў прэпаратаў. Штогод прадпрыемства прапануе айчыннаму і замежным рынкам (Азербайджану, Туркменістану, Казахстану, Расіі) 31 мільён флаконаў з медыкаментамі.



Спецыялізацыя фармацэўтычнай кампаніі — вытворчасць стэрыльных інфузійных і ін'екцыйных раствораў і раствораў для вонкавага выкарыстання. Няспынны пошук шляхоў да таго, каб стаць узорам фармацэўтычнай справы, дыктуе стварэнне новых вытворчасцяў.

Дзесяць гадоў таму на заводзе з'явілася лінія па вытворчасці інфузійных раствораў у поліэтыленавай тары па тэхналогіі Blow-Feal-Seal. У 2014-м тут наладзілі выпуск лекаў у палімерных кантэйнерах, а яшчэ праз два гады — мадэрнізавалі вытворчасць медыкаментозных сродкаў у шкляных бутэльках. Усе гэтыя вытворчасці адпавядаюць патрабаванням GMP (належнай вытворчай практыкі).

Нясвіжскі завод стаў адным з лідараў фармацэўтычнай галіны не толькі праз навейшыя тэхналогіі, але і праз дакладнейшыя метады кантролю якасці і кваліфікаваны персанал, які вывучае тонкасці складанай работы проста на прадпрыемстве. Завадчане ўпэўнены ў сваёй прадукцыі, таму што ў кампаніі прэпараты праходзяць поўны тэхналагічны цыкл — ад кантролю



якасці сыравіны да адгрузкі гатовых і ўпакаваных лекавых сродкаў.

Вынікам карпатлівай працы і пошукаў спецыялістаў прадпрыемства сталі тры інавацыйныя прадукты: арыгінальны кровазамяняльны раствор, полііонны раствор на аснове янтарнай кіслаты і прэпарат амінакіслот з электралітамі для парэнтэральнага харчавання.

Хоць працаваць на фармацэўтычным заводзе складана і адказна, чарга з тых, хто жадае стаць супрацоўнікам прадпрыемства, не менш за сто чалавек. Разлічваць на месца могуць самыя адказныя і адукаваныя. Дзякуючы бездакорнай працы да прафесійнага свята — Дня работніка фармацэўтычнай і мікрабіялагічнай прамысловасці — кампанія прыйшла з добрымі паказчыкамі.

Рост аб'ёму прамысловай прадукцыі сёлета склаў 128,1 %, а рост выручкі ад яе рэалізацыі на аднаго супрацоўніка — 130,9 % (а гэта ні многа ні мала — 23,5 мільёна рублёў увогуле па прадпрыемстве). Пры гэтым тэмп павелічэння даходу ад продажу на аднаго супрацоўніка і тэмп росту зарплаты складае 1,06. Сярэднямесячная заработная плата за перыяд студзень — жнівень склала 1005 рублёў. Таму і праца тут лічыцца элітнай.

А яшчэ... таму што не сорамна глядзець у вочы людзям, якія давяраюць прадукцыі прадпрыемства самае дарагое, што ў іх ёсць — сваё здароўе. Таму і кажуць у кампаніі, што іх найпершы партнёр — чалавечае здароўе, а пасля — усе іншыя.

**Дырэктар завода Генадзь Адольфавіч ЖЫВЕНЬ** цалкам згодны з гэтым меркаваннем **і шчыра віншуе сваіх супрацоўнікаў з прафесійным святам:**

*— Найперш зычу ўсім нашым супрацоўнікам моцнага здароўя і бадзёрага настрою на працу і адпачынак. Няхай ва ўсіх сем'ях пануюць любоў, узаемаразуменне і павага адно да аднаго, каб людзі былі шчаслівыя і задаволеныя. Тады і справа будзе спорыцца, і наша праца на карысць чалавечага здароўя паляпшацца і ўдасканальвацца.*



**Ірына СІДАРОК, Алена ДАЎЖАНОК.**

УНП 600031159


Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

| Извещение о проведении повторного аукциона | | | |
|---|---|---|---|
| Организатор аукциона | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703, оф. 4б | | |
| Продавец | ООО «Алакарт-Дизайн», г. Минск, ул. Мясникова, д. 34, комн. 10 | | |
| Предмет аукциона: | | | |
| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
| **Торговое помещение** | 405,9 кв. м | 500/D-683477 | г. Минск, ул. Якуба Коласа, д. 50, корп. 1, пом. 1Н |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 873 822,00 бел. руб.** (снижена на 20 %) | | | |
| **Задаток 2 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638 | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения победителем торгов за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте www.cpo.by | | | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 21.09.2018 | | | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **30.10.2018** в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 4б, ООО «ИПМ-Консалт оценка» | | |
| **Дата и время окончания приема документов** | **26.10.2018** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 4б, ООО «ИПМ-Консалт оценка» | | |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@ipmconsult.by. Интернет сайт www.cpo.by** | | |



*Настоящим ООО «Белинтерпродукт» уведомляет о том, что 09.10.2018 года на заседании внеочередного общего собрания участников Общества принято решение о начале процесса реорганизации* ***ООО «Белинтерпродукт» в форме присоединения к нему общества с ограниченной ответственностью «Толми-Бел»*** *(зарегистрированное в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за номером 191129542, юридический адрес: 220114. г. Минск, пр-т Независимости, д. 117, к. 1–2, пом. 4, каб. 124), с последующей передачей всех прав, обязанностей и имущества последнего ООО «Белинтерпродукт».*

Требования кредиторов могут быть предъявлены письменно в течение 30 (тридцати) дней от даты публикации настоящего уведомления по следующему адресу: 220088, г. Минск, ул. Смоленская, 25 (5-й этаж, приемная).

УНП 100344432



Выдавецтва «Тэхналогія» рыхтуе да выдання кнігу Зьмітра і Юрася Санько пра вёску Азярычына, што ў Пухавіцкім раене. Прапануем усім, каму гэта цікава, азнаёміцца са зваротам аўтараў да землякоў, змешчаным на сайце «Тэхналогія»: www.tn.by. УНП 100008965



**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении повторного аукциона**

**Лот № 1.** 44/1000 доли капитального строения с инв. № 700/С-85822 (машино-место № 3.1 площадью 16,27 кв. м и часть электрощитовой площадью 0,21 кв. м). Ворота Р 1770-АС инв. № 2030091000. Начальная цена продажи: 7 979,49 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 797,95 руб.

**Лот № 2.** 44/1000 доли капитального строения с инв. № 700/С-85822 (машино-место № 3.2 площадью 16,38 кв. м и часть электрощитовой площадью 0,21 кв. м). Ворота Р 1770-АС инв. № 2030090900. Начальная цена продажи: 7 979,49 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 797,95 руб.

**Лот № 3.** 62/1000 доли капитального строения с инв. № 700/С-85822 (машино-место № 4 площадью 22,80 кв. м и часть электрощитовой площадью 0,22 кв. м). Начальная цена продажи: 10 126,17 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 1012,62 руб.

**Лот № 4.** 82/1000 доли капитального строения с инв. № 700/С-85822 (машино-место № 5 площадью 30,40 кв. м и часть электрощитовой площадью 0,22 кв. м). Начальная цена продажи: 13 384,94 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 1338,49 руб.

**Лот № 5.** 71/1000 доли капитального строения с инв. № 700/С-85822 (машино-место № 7 площадью 26,20 кв. м и часть электрощитовой площадью 0,22 кв. м). Ворота Р 1770-АС инв. № 2030092000. Начальная цена продажи: 12 505,87 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 1250,59 руб.

**Лот № 6.** 79/1000 доли капитального строения с инв. № 700/С-85822 (машино-место № 8 площадью 29,40 кв. м и часть электрощитовой площадью 0,22 кв. м). Ворота Р 1770-АС инв. № 2030092100. Начальная цена продажи: 13 809,38 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 1380,94 руб.

**Лот № 7.** 48/1000 доли капитального строения с инв. № 700/С-85822 (машино-место № 10 площадью 17,77 кв. м и часть электрощитовой площадью 0,22 кв. м). Ворота Р 1770-АС инв. № 2030091900. Начальная цена продажи: 8 758,29 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 875,83 руб.

**Лот № 8.** 42/1000 доли капитального строения с инв. № 700/С-85822 (машино-место № 11.1 площадью 15,45 кв. м и часть электрощитовой площадью 0,22 кв. м). Начальная цена продажи: 6 867,41 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 686,74 руб.

**Лот № 9.** 42/1000 доли капитального строения с инв. № 700/С-85822 (машино-место № 11.2 площадью 15,45 кв. м и часть электрощитовой площадью 0,22 кв. м). Ворота Р 1770-АС инв. № 2030091800. Начальная цена продажи: 7 780,66 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 778,07 руб.

**Лот № 10.** Шкаф релейный ЩРУ-М № 2 инв. № 4070534800. Шкафы управления 2 ед. ном. № 2170012317. Начальная цена продажи: 2 471,92 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 247,19 руб.

| | |
|---|---|
| **Местоположение** | Имущество расположено по адресу: г. Могилев, пр-т Шмидта, 28г, на земельном участке с кадастровым номером 740100000005003209, общей площадью 0,1032 га |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **Аукцион состоится 25 октября 2018 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Последний день подачи заявок и внесения задатка: 24 октября 2018 года до 15.00. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее чем за три дня до даты аукциона |
| **Продавец** | ОАО «Могилевхимволокно», УНП 700117487, Могилевская обл., г. Могилев-35 |
| **Организатор аукциона** | Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352 |
| **Расчетный счет для внесения задатка** | Получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X |
| **Срок и условия оплаты:** победитель аукциона уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона обязан в течение 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата предмета аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты за предмет аукциона | |
| **Справочно для покупателей:** Регистрация купли-продажи доли в РУП «Могилевское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» будет осуществляться на основании договора купли-продажи, при этом технический паспорт на имущество (долю) не изготавливается. В случае отчуждения приобретенного имущества (доли) другому покупателю преимущественное право его приобретения имеют другие дольщики здания гаражей. При регистрации сделки купли-продажи имущества (доли) необходимым будет условие предоставление Могилевским горисполкомом в аренду земельного участка, на котором расположено имущество | |
| **Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номерах газеты «Звязда» от 07.04.2018, от 23.05.2018, от 22.06.2018** | |
| **Дополнительную информацию можно получить по тел.: +375222-72-41-14, +37544-767-65-36** | |



**ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона**

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Молодечненского районного потребительского общества (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже **магазина общей площадью 632,3 кв. м, инв. № 630/С-69297, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 623850100002004279 площадью 0,3953 га (право аренды до 2111 года), по адресу: Минская область, Молодечненский район, г. Молодечно, ул. Великий Гостинец, 144**.

Часть Объекта (66,7 кв. м) сдается в аренду *(сведения об арендаторе можно получить у организатора аукциона или продавца)*.

Начальная цена с НДС (20 %) – **965 645,61** бел. руб. (задаток 10% от начальной цены – 96 564,00 бел. руб.). **Стоимость снижена на 5%.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 2 (двух) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 25.08.2018. Аукцион состоится **26.10.2018** в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **25.10.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

■ 14 кастрычніка — Дзень стандартызацыі

# З ЧЫМ ВАРТА ЛІЧЫЦЦА ПРАФЕСІЯНАЛУ



Дырэктар РУП «Віцебскі ЦСМС» Павел ЯКАЎЛЕЎ.

### ПРАДСТАЎЛЯЕМ КАЛЕКТЫЎ

Гісторыя Віцебскага цэнтра стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі (ЦСМС) пачыналася са стварэння яшчэ ў 1922 годзе (раней, чым створана метралагічная служба ў рэспубліцы) пастаяннага аддзялення Петраградскай паверачнай палаты. У сферу яе дзейнасці была ўключана ўся Віцебская губерня.

У 1926 годзе Віцебская палата мер і вагаў далучаецца да аналагічнай Беларускай палаты, потым арганізавана і рамонтная майстэрня.

Пасля вайны метралагічная служба адраджалася разам з усёй разбуранай народнай гаспадаркай. Даваенны ўзровень адноўлены да 1950 года, а потым пайшло планамернае развіццё. У 1956 годзе з'явілася Віцебская дзяржаўная кантрольная лабараторыя па вымяральнай тэхніцы, распачалася работа ў раёнах — Полацкім, Аршанскім і іншых.

Сёння ў цэнтры, які займаецца разнастайнымі кірункамі прафесійнай дзейнасці, працуе каля 160 інжынераў.

## СЯРОД ПАСЛУГ — УНІКАЛЬНЫЯ

Расказвае **намеснік дырэктара Руслан СМІРНОЎ**:

— Наша зона абслугоўвання ўсё больш пашыраецца, як таго і патрабуе сучасная эканамічная сітуацыя. Па нейкіх кірунках мы абслугоўваем не толькі суседнія раёны, але і аб'екты па ўсёй краіне. Напрыклад, маем унікальнае абсталяванне, дзякуючы якому выконваем работы, звязаныя з вымярэннем электрамагнітнага поля, што ўтвараецца навокал вышак сотавай сувязі. Шчыльна ўзаемадзейнічаем з усімі аператарамі сотавай сувязі. Заказчыкі нам давяраюць і жадаюць, каб з імі працавалі толькі мы. Дарэчы кажучы, у 99 працэнтах выпадкаў электрамагнітная абстаноўка побач з вышкамі нармальная.

А яшчэ аказваем унікальныя паслугі па паверцы і каліброўцы камерцыйных сістэм уліку электраэнергіі, заказы паступаюць не толькі з Віцебскай вобласці. Нашы спецыялісты выконваюць заяўкі кваліфікавана, своечасова.

Айчынныя прадпрыемствы працуюць у дастаткова жорсткіх рынкавых умовах і разумеюць, што без сістэмнага падыходу да пытання якасці прадукцыі ў сучасным свеце існаваць немагчыма. На многіх з іх укараняюцца сістэмы менеджменту якасці (СМЯ) на аснове міжнародных стандартаў, сертыфікацыяй якіх мы таксама займаемся.

Зона ў нас насычаная і прамысловымі аб'ектамі, і будаўнічымі арганізацыямі, развіты аграрны сектар. І каб адпавядаць гэтай шматпрофільнасці, якая да таго ж дапаўняецца дынамічнасцю развіцця суб'ектаў гаспадарання, мы вялікую ўвагу ўдзяляем падрыхтоўцы персаналу. Без чаго не зможам дапамагаць свайму рэгіёну працаваць эфектыўна.

І трымаем цесную сувязь са сваімі прадпрыемствамі. Даволі часта праводзім кансультацыі для іх. Нашы спецыялісты выязджаюць на месцы і дапамагаюць у вырашэнні канкрэтных праблем. Пастаяннымі сталі кансультацыйныя семінары і іншыя формы навучання персаналу прадпрыемстваў. Скажам, кожны месяц у нас праходзяць два-тры семінары, у рабоце якіх удзельнічаюць 20—25 спецыялістаў з розных прадпрыемстваў. Гэта людзі, што адказваюць за якасць у рэальным сектары эканомікі, і яны павінны разумець, як будаваць работу.

З верасня гэтага года спыніла сваё існаванне старая версія стандарту 9001. За год-паўтара мы ведалі, што будзе новая версія, і паспелі падрыхтавацца і падрыхтаваць уласную зону. Старыя сертыфікаты не дзейнічаюць, і зараз усе заняты ўкараненнем новай сістэмы. У ёй крыху іншыя падыходы, усё разглядаецца праз прызму рызыка-арыентаванага менеджменту. Прадпрыемствы павінны перагледзець свае падыходы і навучыцца бачыць магчымыя рызыкі, ацэньваць іх і правільна на іх уплываць — каб мінімізаваць. Пачынаючы ад інфраструктуры — абсталявання, памяшканняў, рабочых месцаў, і заканчваючы персаналам, ад якога залежыць захаванне ўсіх тэхналагічных момантаў. Каб цалкам выключыць уплыў чалавечага фактару. Размова ідзе пра больш скрупулёзнае захаванне тэхналогіі вытворчых працэсаў.

*— У якой ступені вы ўплываеце на чыста сельскагаспадарчую вытворчасць, не на перапрацоўку? Як часта бываеце на ферме, у полі?*



Намеснік дырэктара — галоўны метролаг Вера ХАНДОГІНА (злева) і намеснік дырэктара па стандартызацыі і кіраванні якасцю Руслан СМІРНОЎ на міжнароднай канферэнцыі.

— Асноўная задача органаў стандартызацыі — дапамога прадпрыемствам, усім тым працэсам, якія там адбываюцца. Напрамую мы не ўмешваемся, але ад нашай працы таксама многае залежыць. Скажам, калі будуюцца новыя малочнатаварныя фермы, то яны таксама павінны адпавядаць пэўным нормам праектавання. У разгар масавага будаўніцтва комплексаў мы праводзілі свае абследаванні ў месцах іх узвядзення, работы было вельмі многа. Як і клопатаў з самімі прадпрыемствамі, што ўзводзілі гэтыя комплексы, — праводзілі кантроль якасці будаўніча-мантажных работ. Маем спецыяльны выпрабавальны цэнтр, персанал якога ўмее гэта рабіць. Мы акрэдытаваны на выкананне такой работы, валодаем дастатковай кваліфікацыяй, аснашчаны адпаведнымі прыборамі і абсталяваннем. Кантроль праводзіўся ў рамках сертыфікацыі будаўнічых прадпрыемстваў, яны таксама павінны мець сертыфікаты на пэўныя віды будаўнічых работ.

Да нас прыходзіць на выпрабаванні ў харчовай лабараторыі значная колькасць сельскагаспадарчай прадукцыі. Усе стандарты, дзеючыя тэхнічныя ўмовы, рэгламенты накіраваны на тое, каб упэўніцца, што прадукцыя бяспечная.

Прымяненне стандартаў у нашай краіне — справа для прадпрыемства добраахвотная, але прадукцыя павінна быць бяспечнай для здароўя людзей і навакольнага асяроддзя.

*— Як спажывец прадукцыі, якая выпускаецца ў Беларусі, скажу вам, што не разумею, чаму стандарты — добраахвотная справа для вытворцаў.*

— Сёння рэальнаму сектару можна працаваць па дакументацыі, якую вытворца выпускае сам — па тэхнічных умовах, рэцэптурах і гэтак далей. І нельга зрабіць такі сур'ёзны дакумент, а яго зацвярджае кіраўнік прадпрыемства, не адштурхоўваючыся ад патрабаванняў стандартаў. У тэхнічных умовах могуць быць закладзены нават больш жорсткія пазіцыі.

Абавязковы кантроль сыравіны і камплектуючых, а таксама пасляаперацыйны кантроль.

Наладжаны і кантроль з боку дзяржавы — прыёмачныя і дзяржаўныя контрольныя выпрабаванні ў перыяд дзеяння сертыфіката.



Начальнік сектара сертыфікацыі сістэм менеджменту Аляксандр КУЛЯШОЎ, начальнік сектара стандартызацыі і сертыфікацыі прадпрыемстваў харчовай галіны Алена РАВУНОВА і вядучы інжынер гэтага сектара Ірына ДАРАФЕЕВА за абмеркаваннем актуальных праблем.

*— Даказана практыкай, што дзейсным механізмам гарантаванага ўплыву на якасць з'яўляюцца сістэмы менеджменту якасці (СМЯ), пра якія вы ўпамянулі. Ці можна казаць аб іх татальным укараненні на прадпрыемствах вашай зоны?*

— У прамысловасці — так, бо гэта востра неабходнасць на самой прамысловасці. І наша работа сфакусіравана на гэтым кірунку. У нас моцныя канструктыўныя сувязі з усімі прадпрыемствамі зоны ў самых разнастайных галінах. На ўсіх прадпрыемствах дзяржаўнай формы ўласнасці сістэма менеджменту якасці ў тым ці іншым выглядзе існуе. Недзе яна ўжо сертыфікавана, недзе дапрацоўваецца, а недзе мы яшчэ дапамагаем укараняць. Сёння адна з найважнейшых задач — павышэнне эфектыўнасці ўжо дзеючых сістэм. Важна, каб персанал не пакідаў сістэму без увагі і пасля таго, як завершана ўкараненне.

*— А ў тых выпадках, калі на прадпрыемстве да гэтага часу не ўкаранёна СМЯ, — што перашкаджае?*

— У кіраўніка адсутнічае разуменне таго, што гэта табе і калектыву можа прынесці несумненную карысць. Адсутнасць бачання перспектывы. Але на сённяшні дзень такіх усё менш.

*— СМЯ пазней пачалі ўкараняць у будаўніцтве, бытоўцы, гандлі... Мы не ўпусцілі гэтыя галіны?*

— Усё пазнаецца ў параўнанні. Многае ў нашым жыцці, у тым ліку ў эканоміцы і ў інфраструктуры, знаходзіцца на значна больш высокім узроўні, чым у нашых суседзяў. Мы займаем дастойнае месца. Магчыма, знаходзімся не на першых пазіцыях, але і не ў хвасце. Супакойвацца не варта, бо свет не стаіць на месцы, развіццё ідзе пастаянна. Укараненне стандартаў у паўсядзённым жыцці рухае нас да вяршынь цывілізаванага грамадства. Мы ўсе хочам не толькі якаснай прадукцыі, але і якаснага жыцця.

*— Паралельна вялося ўкараненне сістэмы ХАССП...*

— Другія Еўрапейскія гульні гэтым разам будуць праводзіцца наступным летам у Беларусі, і адно з патрабаванняў арганізатараў — абавязковая наяўнасць сістэмы ХАССП на прадпрыемствах, занятых абслугоўваннем гульняў ці пастаўкамі сваёй прадукцыі ўдзельнікам і гасцям. Гэта хоць і не вялікі, але ёмісты сегмент грамадскага харчавання і харчовай прамысловасці. Персанал цэнтра задзейнічаны ў аказанні дапамогі такім калектывам ва ўкараненні і адладжванні сістэмы ХАССП. Нашы спецыялісты ў свой час прайшлі з вытворчасці і маюць багаты асабісты вопыт. Іх амаль ніколі няма на месцы, яны пастаянна ў камандзіроўках, на прадпрыемствах, «адпрацоўваюць тэму».

## ЦІ ПАТРЭБНЫ СЯМ'І СТАНДАРТЫ

Мы папрасілі адказаць на некалькі пытанняў і **дырэктара цэнтра Паўла ЯКАЎЛЕВА**.

*— У апошнія дзесяцігоддзе органамі стандартызацыі ўсё большая ўвага ўдзяляецца рабоце прыватнага сектара эканомікі, бізнесу. Раскажыце пра гэты кірунак сваёй дзейнасці, Павел Леанідавіч.*

— Вялікі, сур'ёзны ўчастак работы. Калі гаварыць пра сярэдні бізнес, асабліва ў вытворчай сферы, то мы вельмі шчыльна з ім працуем. Гістарычна склалася, што ў Віцебску былі развіты станкабудаванне і прыборабудаванне, прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці таксама налічваўся не адзін дзясятак. З распадам вялікай краіны сітуацыя змянілася. На базе прамысловых гігантаў створана шмат невялікіх і сярэдніх прадпрыемстваў, якія прынялі на работу іх людзей. Той жа кабельны «Энергакамплект». Дзейнічаюць і іншыя невялікія прыборабудаўнічыя прадпрыемствы. Праводзім выпрабаванне і сертыфікацыю іх прадукцыі, ацэнку вытворчасці, вучобу кадраў.

Стварылі выпрабавальную лабараторыю, якая дазваляе праводзіць выпрабаванні прадукцыі лёгкай прамысловасці па многіх паказчыках, і яе паслугамі карыстаюцца і індывідуальныя прадпрымальнікі. Многія з іх працуюць проста цудоўна.

Тыя прыватныя прадпрыемствы, дзе працуе СМЯ, як правіла працвітаюць, бо выпускаюць прадукцыю якасную, запатрабаваную, канкурэнтаздольную. Маюць заказчыкаў і заказы. Але, на жаль, так не ўсюды. І сваю задачу бачым у тым, каб перастаў пераважаць праславуты «чалавечы фактар».

*— І тут мы выходзім на цікавую тэму. Не ўсе сферы чалавечага быцця пакуль ахоплены стандартызацыяй, пра што засведчылі і ўдзельнікі нядаўняга Сусветнага дня акрэдытацыі. Ці падлягае стандартызацыі сфера чалавечых адносін, міжасабовых — і не толькі?*

— Ці распаўсюджваецца стандартызацыя на сферу чалавечых адносін? У ахове здароўя ўжо зараз існуюць свае стандарты — схемы лячэння захворванняў, так званыя пратаколы. У адукацыі — адукацыйныя праграмы па розных дысцыплінах, зацверджаныя міністэрствам. Школы вельмі неахвотна ад іх адступаюць. Гэта свайго роду стандарты. У нас у краіне ўкаранёны таксама сацыяльныя стандарты, іх структура шырока вядомая. Той жа пералік неабходных прадуктаў у любым магазіне — таксама стандарт.

*— А грамадскія адносіны?*

— Падагнаць усё ва ўзаемаадносінах паміж людзьмі пад нейкія стандарты складана. Тым не менш чалавецтва заўсёды да гэтага імкнулася, распрацоўваючы сістэмы разгалінаванага заканадаўства. Любы закон — гэта стандарт. Напрыклад, у сямейных адносінах існуе Сямейны кодэкс, апошнім часам з'явіўся шлюбны дагавор. Чым вам не стандарт?

Нам не варта забываць выпрацаваны чалавецтвам досвед пакаленняў, якія жылі да нас. Напрацаваны стагоддзямі вопыт народа нічым не заменіш. У пэўным сэнсе стандарты ў эканоміцы — гэта таксама сфармуляваны вопыт вялікіх груп людзей, цэлых прафесій, нават галін. Гэта найлепшае, што ёсць у прафесіяналаў, і з ім варта лічыцца.

Калі гаварыць пра эфектыўнасць нашай работы, то прывяду ўсяго дзве лічбы. За мінулы год мы пералічылі ў бюджэт адзін мільён сорак тысяч рублёў. На старыя грошы — дзесяць мільярдаў. У фонд сацыяльнай абароны — пяцьсот семдзесят тысяч рублёў. Гэта значыць, яшчэ пяць мільярдаў у старых грашах. Падаткі плацім дзень у дзень, заработную плату таксама своечасова, без спазненняў. Гэта як бы наш унутраны стандарт, якога мы прытрымліваемся.

**Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.**

УНП 300000224.



Вядучы інжынер Аляксей ПЛЕЦЯГА.



Вядучы інжынер Уладзімір МАЛЮЖАНЕЦ.

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** Панядзелак рэкамендуецца правесці без мітусні і спешкі, карыстаючыся пладамі поспехаў, дасягнутых раней. Новыя справы можна пачынаць з аўторка, тым больш што ваша сабранасць дазволіць тварыць цуды. Шанцаванне ў дробязях стане прычынай аптымістычных настрояў, што таксама вельмі садзейнічае павышэнню працаздольнасці. Серада дасць магчымасць пакінуць многія праблемы ў мінулым. У чацвер і пятніцу паспрабуйце засцерагчы сябе ад непатрэбных размоў і кантактаў. Субота складзецца ўдала, калі вы праявіце актыўнасць, а не праведзяце выхадныя на канапе.

**ЦЯЛЕЦ.** Час хоць бы злёгку абнавіць свой імідж, гэта будзе спрыяць кар'ернаму прасоўванню. Сканцэнтруйце ўвагу на працы, магчыма раптоўнае павелічэнне нагрузкі, з'яўленне новых абавязкаў. Важна праявіць сябе з лепшага боку. У пятніцу можаце быць занадта рэзкімі ў меркаваннях, што пагражае сваркай. У суботу вас можа наведаць выдатная ідэя ў галіне фінансаў.

**БЛІЗНЯТЫ.** Паспрабуйце прывесці эмоцыі ў парадак і не кідайцеся ў крайнасці. Вас чакае прыемнае падарожжа, адкрыццё новых месцаў. Яркія ўражанні будуць мяняцца як у калейдаскопе. Выдатны час для дзелавых паездак і сустрэч з сябрамі. Вы ўступаеце ў новую фазу і ў рамантычных адносінах. У выхадныя зможаце добра адпачыць і адчуць гармонію з сабой і са светам.

**РАК.** Будзеце лёгкія на ўздым, актыўныя і больш нецярплівыя, чым звычайна. Павысіцца агульны тонус і палепшыцца настрой. У панядзелак справы могуць пайсці не так, як вы планавалі, таму неабходна выправіць памылкі, якія дапусцілі раней. У пятніцу будзьце асцярожныя пры зносінах, бо людзі не заўсёды кажуць тое, што думаюць. У суботу парада, атрыманая ад блізкага чалавека, дапаможа знайсці выхад з тупіка ў асабістым жыцці.

**ЛЕЎ.** На гэтым тыдні шум і мітусня вялікіх кампаній будзе гнясці вас. Пашукайце магчымасць правесці максімум часу ў спакойнай абстаноўцы. У аўторак, перш чым вырашаць нейкую праблему, разгледзьце яе больш уважліва. Не выключана, што ваша ўспрыманне сітуацыі зменіцца і рашэнне запатрабуе зусім іншага падыходу. У чацвер давядзецца адстойваць свае ідэі. Будзе магчымасць умацаваць аўтарытэт. Не забывайце чаргаваць працу з адпачынкам.

**ДЗЕВА.** Вялікая імавернасць поспехаў у кар'еры і асабістым жыцці. Але не варта спяшацца і выбіраць дэвіз «усё ці нічога». Спачатку неабходна праверыць свае амбіцыі рэальнымі справамі. Падтрымлівайце ідэі начальства і не скупіцеся на ка- рысныя парады калегам. Праца, вядома, не заўсёды такая прыемная, як пяшчотныя позіркі, але карысці ад яе ўсё ж такі значна больш. І памятайце: нешматслоўнасць у поўных сітуацыях можа тварыць цуды.

**ШАЛІ.** На гэтым тыдні самымі лепшымі лекамі ад жыццёвых расчараванняў будзе поўнае акунанне ў любімую працу пры наяўнасці такой. Не спрабуйце філасофстваваць і скардзіцца. Калі знойдзеце ў сабе сілы і аптымізм, будныя дні пройдуць спакойна і мерна. За важныя рашэнні і ўчынкі лепш брацца ў панядзелак і аўторак, калі супадуць вашы сілы і магчымасці. У адносінах з блізкімі людзьмі ёсць рызыка неразумення.

**СКАРПІЁН.** Спрыяльны час для новых пачынанняў і новых уражанняў. Каб паспяхова рухацца наперад, спатрэбіцца звярнуцца да інтуіцыі. Усе вашы геніяльныя ідэі могуць ажыццявіцца толькі пры падтрымцы навакольных. Нават самыя экстравагантныя з іх знойдуць станоўчы водгук. Вы будзеце з лёгкасцю арыентавацца нават у незнаёмым месцы, зможаце зачараваць усіх, каго толькі захочаце.

**СТРАЛЕЦ.** На гэтым тыдні нямала сіл давядзецца прыкласці ў працы, затое гэта прынясе дадатковы прыбытак. Не выключана, што наступіць вельмі важны перыяд у кар'еры. Праверце на жыццядольнасць вашу стратэгію, пажадана, каб яна не адштурхоўвала навакольных. Паспрабуйце не пачынаць у аўторак ніякіх сур'ёзных праектаў, бо эмоцыі — не самы лепшы дарадца ў любой справе. Чацвер можа прынесці шмат мітусні, але затое вынік перасягне ўсе вашы чаканні. Гэта выдатны дзень для ўладжвання адносін са сваякамі.

**КАЗЯРОГ.** У пачатку тыдня можа падступна падкрасціся хандра: яна захопіць вас у палон і вы трапіце ў сетку дрэннага настрою. Напружаны рытм мінулага тыдня можа аказаць уплыў на працаздольнасць, а калі да існуючых абавязкаў дададуцца новыя, будзе цяжка з гэтым справіцца. У сераду не ўвязвайцеся ў інтрыгі — гэта не дадасць душэўнай раўнавагі. У выхадныя дні адпачніце ад мітусні і шуму.

**ВАДАЛІЎ.** Станоўчыя вынікі вашай дзейнасці прымусяць працаваць з нарастаючымі тэмпамі. Прафесійная сфера запатрабуе пільнай увагі і дадатковага часу, які давядзецца адабраць у асабістага жыцця. Так што магчымы канфлікты з другой палавінкай. У выхадныя дзеці могуць сапсаваць настрой, але не пераж- вайце, будзе даволі лёгка заклікаць іх да парадку.

**РЫБЫ.** Практычна ўвесь тыдзень будзе прысвечаны працы і дзелавым кантактам. Адчуеце, што знаходзіцеся ў самым віры падзей. Поспех у прафесійнай дзейнасці будзе спадарожнічаць, калі падыдзеце да працы з разумным кансерватызмам і вернасцю старым звычкам. Сітуацыя павінна стаць спрыяльнай да канца тыдня, што знойдзе адлюстраванне ў росце матэрыяльнага дабрабыту. А вось ніякай рамантыкі зоркі не абяцаюць.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.31 | 18.20 | 10.49 |
| Віцебск — | 7.23 | 18.08 | 10.45 |
| Магілёў — | 7.22 | 18.10 | 10.48 |
| Гомель — | 7.16 | 18.09 | 10.53 |
| Гродна — | 7.46 | 18.35 | 10.49 |
| Брэст — | 7.45 | 18.38 | 10.53 |

## Месяц

*Маладзік 9 кастрычніка. Месяц у сузор'і Стральца.*

## Імяніны

*Пр.* Івана.
*К.* Вітольда, Серафіма, Яўстаха.



Фота Алены ДАЎЖАНОК.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

## 12 КАСТРЫЧНІКА

**У краіне**

**1905** год — нарадзіўся (г. Мінск) Канстанцін Іосіфавіч Хмялеўскі, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Мінскага антыфашысцкага падполля ў Вялікую Айчынную вайну. Падчас акупацыі Мінска з верасня 1941 года ўдзельнічаў у арганізацыі падполля, разам з М. К. Каржанеўскім кіраваў падпольнай групай у Кастрычніцкім раёне, накіроўваў дзейнасць маладзёжна-камсамольскіх груп. З мая 1942-га — сакратар падпольнага Кастрычніцкага райкама КП(б) Б, з чэрвеня — член Мінскага гаркама КП(б) Б, начальнік аддзела па арганізацыі дыверсій, удзельнічаў у распаўсюджванні падпольнай газеты «Звязда». У кастрычніку 1942 года арыштаваны і пасля катаванняў расстраляны. Яго імем названа вуліца ў Мінску.

**1913** год — нарадзіўся (г. Мінск) Уладзімір Паўлавіч Цяслюк, кінаапeратар і рэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. У час Вялікай Айчыннай вайны — франтавы апeратар, удзельнічаў у здымках фільмаў «Разгром нямецкіх войскаў пад Масквой», «Дзень вайны» і іншых. Яго кадры выкарыстаны ў кінаэпапеі «Вялікая Айчынная». З 1945 года на кінастудыі «Беларусьфільм» здымаў хроніку, дакументальныя і навукова-папулярныя фільмы. З 1960-х гадоў выступаў і як рэжысёр: фільмы «Сустрэча герояў Брэста», «Штрыхі да партрэта», «Край крынічны». Памёр у 1977 годзе.



**1943** год — пад мястэчкам Леніна (Магілёўская вобласць) у складзе Заходняга фронту прыняла баявое хрышчэнне 1-я Польская пяхотная дывізія імя Т. Касцюшкі, сфарміраваная на тэрыторыі СССР.

**1968** год — пачаліся XIX летнія Алімпійскія гульні ў Мехіка (працягваліся да 27 кастрычніка). Алімпійскімі чэмпіёнамі ў складзе зборнай каманды Савецкага Саюза сталі беларускія спартсмены Ларыса Петрык, Алена Бялова, Аляксандр Мядзведзь, Тацццяна Самусенка, Рамуальд Клім, Юрый Смалякоў, Аляксей Нікančаў, Віталь Пархімовіч.

**У свеце**

*Сусветны дзень яйка. Адзначаецца ў многіх краінах свету па ініцыятыве Міжнароднай асацыяцыі вытворцаў яек у другую пятніцу кастрычніка.*

**1428** год — пачалася аблога англічанамі Арлеана. Яна доўжылася сем месяцаў і стала паваротным пунктам у Стогадовай вайне паміж Англіяй і Францыяй і праславіла імя Жанны д'Арк.

**1929** год — нарадзіўся Ралан Антонавіч Быкаў, савецкі і расійскі акцёр, рэжысёр тэатра і кіно, народны артыст СССР. Зняў фільмы «Увага, чарапаха!», «Аўтамабіль, скрыпка і сабака Клякса», «Пудзіла» і многія іншыя. Памёр у 1998 годзе.

**1935** год — нарадзіўся Лучана Паварoці, італьянскі спявак, адзін з самых папулярных оперных тэнараў XX стагоддзя. Памёр у 2007 годзе.

## УСМІХНЕМСЯ

**Дзяўчына, якая прыйшла на першае спатканне з бутэлькай гарэлкі, ужо выклікае сімпатыю.**

Жонка — мужу:
— Ты нават не заўважыў, што я пафарбавалася!
— Ды заўважыў я, заўважыў! Гэты колер табе пасуе значна больш!
— А я НЕ пафарбавалася!

**Можа быць, вяселле абышлося б і без бойкі, але маладыя пачалі нецярпліва ўскрываць канверты.**

Бухгалтары дзеляцца на два тыпы:
— У акулярах.
— У вышуку.

**Жонка западозрыла нядобрае, калі ў мяне дзве бляшанкі піва, набытыя пры ёй, не заканчваліся чатыры гадзіны.**

— Ганначка, фуршэт — гэта калі рукамі?
— Вова, фуршэт — гэта калі стоячы!



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3779.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 11 кастрычніка 2018 года.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

12 кастрычніка 2018 г. № 41 (474)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ТЕМА НЕДЕЛИ



В церемонии открытия V Форума регионов Беларуси и России приняли участие (слева направо) посол Российской Федерации в Республике Беларусь Михаил БАБИЧ, председатель Совета Федерации Федерального Собрания Российской Федерации Валентина МАТВИЕНКО, председатель Совета Республики Национального собрания Республики Беларусь Михаил МЯСНИКОВИЧ.

Фото Анны ЗАНКОВИЧ.

# НА ПОРОГЕ НОВЫХ ДОСТИЖЕНИЙ

## В Могилеве проходит V Форум регионов Беларуси и России

ПРОДОЛЖЕНИЕ ТЕМЫ — на 2–3-й стр.

У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

# ІНТЭГРАЦЫЯ ПАЧЫНАЕЦЦА З МОЛАДЗІ

## У Магілёве віталі ўдзельнікаў VI Маладзёжнага форуму Беларусі і Расіі «Моладзь — за Саюзную дзяржаву»

**Маладзёжны форум стаў часткай афіцыйнай праграмы V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Ён аб'яднаў прадстаўнікоў маладзёжных і дзіцячых грамадскіх аб'яднанняў дзвюх краін, маладзёжных парламентаў, саюзаў маладых адвакатаў і прадпрымальнікаў з усёй Беларусі і 10 рэгіёнаў Расіі.**

Адной са значных яго падзей стала фарсайт-сесія, на якой хлопцы і дзяўчаты маглі задаць пытанні міністру адукацыі Беларусі Ігару Карпенку, старшыні Нацыянальнага Савета маладзёжных і дзіцячых аб'яднанняў Расіі Рыгору Петушкову, старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктару Сірэнку. Удзельнікі дыялогу цікавіліся, што робіцца для таго, каб моладзь абедзвюх краін аднолькава магла рэалізаваць свой патэнцыял.

стар. 2



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

# СЁННЯ Ў НУМАРЫ


## Кантакты прыцягваюць кантракты



Як беларускія рэгіёны супрацоўнічаюць з расійскімі. стар. 4–15

## Як выробляць лён



Навучым удмурцкіх спецыялістаў. стар. 13

## Бліжэй да зор




Брэсцкі раён пасябраваў з Зорным гарадком, што ў Падмаскоўі. стар. 14

## Да пушкінскіх мясцін



Адмысловы турыстычны маршрут прапануюць распачаць на Віцебшчыне. стар. 14

## Каго шукаюць у Гродне?



На якую вакансію з заробкам ад 1000 рублёў ахвотных няшмат... стар. 16

КРАСНОАРМЕЙСКАЯ, 9



# ГОТОВЫ УЧИТЬ И НАУЧИТЬСЯ

*Беларусь и ЮАР обладают потенциалом для наращивания взаимной торговли*

**Такое мнение высказала заместитель председателя Совета Республики Национального собрания Беларуси Марианна Щеткина на встрече с Чрезвычайным и Полномочным Послом Южноафриканской Республики в нашей стране Номасонто Марией Сибанда-Туси.**


sovrep.gov.by

Белорусскую сторону на мероприятии представили председатель Постоянной комиссии по законодательству и государственному строительству Алла Бодак и председатель Постоянной комиссии по международным делам и национальной безопасности Сергей Рахманов.

Какие вопросы обсудили на встрече? В первую очередь это расширение взаимодействия парламентов двух стран, а также углубление торгово-экономического и гуманитарного сотрудничества.

По словам Марианны Щеткиной, в качестве одного из главных приоритетов белорусской внешней политики на Африканском континенте выступает именно ЮАР. Заместитель председателя Совета Республики подчеркнула, что обе страны обладают всем необходимым для значительного наращивания взаимной торговли, развития промышленной и сельскохозяйственной кооперации. «Мы готовы делиться технологиями и обеспечить создание совместных машиностроительных предприятий на территории ЮАР», — добавила она.

В свою очередь Номасонто Мария Сибанда-Туси отметила, что Южноафриканская Республика заинтересована в дальнейшем развитии межрегионального сотрудничества. Расширять партнерство нужно также в сельском хозяйстве и машиностроительной отрасли. Она подчеркнула: ЮАР может многому научиться у Беларуси.

Еще одна важная тема состоявшейся встречи — гендерное равенство. Стороны обсудили роль женских организаций в расширении прав и возможностей женщин обоих государств. Марианна Щеткина рассказала послу о деятельности Белорусского союза женщин. По ее словам, благодаря женской дипломатии реально решать вопросы различной тематики, а также обмениваться ценным опытом. В перспективе может быть налажено взаимодействие между женскими организациями Беларуси и ЮАР — по крайней мере, интерес к подобному сотрудничеству возник на этой встрече.

# ВСЕ ВНИМАНИЕ — НА РЕГИОНЫ

**На этой неделе председатель Постоянной комиссии Совета Республики Национального собрания Беларуси по международным делам и национальной безопасности Сергей Рахманов встретился с делегацией депутатов федеральной земли Берлин.**

В центре внимания белорусской и немецкой сторон оказались актуальные вопросы налаживания двустороннего взаимодействия, однако особое внимание было уделено таким аспектам, как дальнейшее развитие двусторонних торгово-экономических контактов и установление прямых региональных связей.

О сотрудничестве на уровне регионов во время встречи отдельно высказался и Сергей Рахманов: по его словам, наша страна заинтересована в углублении взаимодействия на местах. В каких сферах? Их спектр чрезвычайно широк, главное, чтобы для обеих сторон это было интересно и прибыльно.

# УСЛЫШАТ И ПОМОГУТ

**Член Президиума Совета Республики Владимир Пантюхов провел личный прием граждан.**

Кроме того, председатель Постоянной комиссии Совета Республики Национального собрания Беларуси по экономике, бюджету и финансам провел прямую телефонную линию в Краснопольском районном Совете депутатов Могилевской области.

Граждане обращались к парламентарию по самым разнообразным вопросам: их интересовала работа служб ЖКХ и здравоохранения, социально-экономическое развитие района. Кроме того, поднималась тема благоустройства и санитарного содержания территорий, в частности дороги, освещения.

Каждый получил исчерпывающий ответ на свой вопрос: Владимир Пантюхов дал необходимые разъяснения. Кроме того, некоторые темы были взяты парламентарием под личный контроль.

**Владислав ЛУКАШЕВИЧ.**

# НА ПОРОГЕ НОВЫХ ДОСТИЖЕНИЙ




**Местом проведения масштабного и значимого для обеих стран мероприятия стал этот областной центр, куда на три дня съехались более 20 российских губернаторов, а также 17 руководителей представительных органов власти регионов Российской Федерации. От белорусской стороны — все губернаторы, все председатели областных Советов депутатов. Кроме того, широко представлена бизнес-среда. Всего для участия в форуме приехало порядка двух тысяч участников.**

Ожидания от форума действительно высоки: на пресс-конференции в преддверии мероприятия заявили, что запланировано подписание более 70 документов о межправительственном, областном и районном сотрудничестве. Впечатляют и суммы контрактов — ожидаются рекордные подписания не менее чем на 500 миллионов долларов.

- 18 мая 2017 года Мінэканамразвіцця Іркуцкай вобласці і кампанія ААТ «Магілёўліфтмаш» падпісалі пагадненне аб размяшчэнні ва Усоллі-Сібірскім сумеснага прадпрыемства па зборцы ліфтавага абсталявання.
- У чэрвені 2017 года дэлегацыя Іркуцкай вобласці прыняла ўдзел у міжнароднай спецыялізаванай выстаўцы «БелАгра-2017», дзе ЗАТ «Облагроснаб» правяло перамовы з прадстаўнікамі «МТЗ-Холдынг» аб пастаўках трактароў малой магутнасці з прадастаўленнем 30 %-най зніжкі.
- 30 чэрвеня 2017 года — на Форуме рэгіёнаў Расіі і Беларусі падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве паміж урадам Іркуцкай вобласці і Брэсцкім абласным выканаўчым камітэтам.

«Пасля падпісання пагаднення аб супрацоўніцтве з Брэсцкай вобласцю павялічыліся пастаўкі сельгаспрадукцыі з гэтага рэгіёна. Пастаянныя сталі паездкі прадстаўнікоў дзелавых колаў, якія знаходзяць агульную мову і наладжваюць супрацоўніцтва, — расказаў губернатар. — Мы ўжо прымалі ў сябе дэлегацыю з Брэста на чале са старшынёй аблвыканкама Анатолем Лісам. Мы з Анатолем Васілевічам знаходзім паразуменне па ўсіх пытаннях, у нас складзіся вельмі добрыя сяброўскія адносіны...»

Акрамя эканамічнага супрацоўніцтва, «чырвоны» губернатар Іркуцка (Сяргей Георгіевіч — прадстаўнік КПРФ) бачыць вельмі важным супрацоўніцтва гуманітарнае, асабліва ў плане захавання гістарычнай праўды і патрыятычнага выхавання. «Я быў уражаны тым, што ўбачыў у Брэсцкай крэпасці падчас сваёй паездкі, — падзяліўся ён з журналістамі. — Таму 22 чэрвеня мы адправілі нашу дзіцячую дэлегацыю для ўдзелу ў мітынгу-рэквіеме, і яны таксама былі здзіўлены тым, як свята шануюць у Беларусі памяць аб тых страшных падзеях нашай агульнай гісторыі. Што такое гераізм і як гэта — аддаць сваё жыццё за радзіму, лічу, што цяпер падрастаючаму пакаленню карысна задумвацца над гэтымі пытаннямі». Што датычыцца культурнага супрацоўніцтва паміж Іркуцкай вобласцю і нашай краінай, дык тут вельмі дапамагае беларуская дыяспара ў сібірскім рэгіёне. Яна, па ацэнцы губернатара, «адна з самых актыўных, якая шчыра рупіцца аб захаванні сваёй самабытнасці і народных традыцый».

У вялікай па плошчы вобласці (на яе тэрыторыі размесціцца тры Беларусі) з не меншымі прыроднымі багаццямі (адно возера Байкал з яго запасамі прэснай вады чаго вартае, а тайга!) вялікая і прыцягальнасць для айчыннага і замежнага бізнесу. Губернатар не супраць прыходу інвестараў, нават вітае іх, але займае цвёрдую пазіцыю: «Любы бізнесмен будзе шукаць у нас лёгкі варыянт: у нашым выпадку — гэта ўзяць і выкарыстаць прыродныя багацці. Але гэта мы — дзяржава, улада на гэтай зямлі, вырашаем, што мы будзем рабіць для развіцця гэтага краю, і прапаноўваць бізнесу далучацца да гэтай справы, ствараючы для яго спрыяльныя ўмовы».

Што датычыцца сумесных з Беларуссю прадпрыемстваў, тут работа вядзецца па некалькіх кірунках, але адзін праект ужо рэальна працуе. «Мы стварылі сумесную вытворчасць ліфтаў, і зараз, дзякуючы ў тым ліку і гэтаму, паспяхова вырашаем пытанне капітальнага рамонту жылля ў гарадах, — гаворыць Сяргей Леўчанка. — Сумесна выпусцілі ўжо каля 300 ліфтаў. Перш чым спыніцца менавіта на Магілёўскім прадпрыемстве, доўга выбіралі сярод сваіх айчынных вытворцаў, але па спалучэнні цана — якасць спыніліся на беларускіх».

Сярод іншых перспектыўных кірункаў супрацоўніцтва Сяргей Леўчанка назваў пастаўкі ў рэгіён сельскагаспадарчай тэхнікі і абсталявання беларускай вытворчасці, стварэнне перапрацоўчых прадпрыемстваў у сферы сельскай гаспадаркі і дрэваапрацоўкі ў Іркуцкай вобласці, пашырэнне таварнай наменклатуры ўзаемных паставак, развіццё супрацоўніцтва ў галіне турызму.

У тым, што ўсе пагадненні — падпісаныя і якія падпішуцца ў хуткім часе — будуць якасна выконвацца з абодвух бакоў, губернатар Іркуцкай вобласці не сумняваецца. Пра сумленнасць і адказнасць беларусаў ведаюць ва ўсім свеце, а пра сваіх землякоў Сяргей Леўчанка кажа так: «Сібіракі — вельмі адказныя людзі, яны не спадзяюцца на дзядзьку, які прыйдзе і вырашыць іх праблемы. Тут усё трымаецца на тых, хто сам сябе зможа забяспечыць і абараніць, хто не ные, не плача, не чакае манны нябеснай...»

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

*Іркуцк — Мінск.*

# Сумесна зрабіць вопратку, якая не гарыць

## А яшчэ Удмурцкая Рэспубліка павучыцца ў беларусаў, як вырошчваць лён

**Выгадныя здзелкі і прадукцыйнае супрацоўніцтва, экспарт і імпарт тавараў — такія тэмы цікавілі бізнес-дэлегацыю з Іжэўска, якая наведвала знакавыя прадпрыемствы сталіцы. А ў сераду адбылася сустрэча кіраўнікоў вядучых прадпрыемстваў Удмурцкай Рэспублікі з беларускім бокам у Мінскім аддзяленні Беларускай гандлёва-прамысловай палаты.**



Пасля сустрэчы **кіраўнік цэнтра каардынацыі падтрымкі экспартна арыентаваных суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва АТ «Карпарацыя развіцця Удмурцкай Рэспублікі» Валерыя АНТАНЕНКА** адказала на нашы пытанні.

**— З якімі планамі вы прыехалі ў Беларусь гэтым разам?**

— У нас гэта ўжо другі афіцыйны візіт сёлета ў вашу краіну. Нягледзячы на тое што Удмурцкая Рэспубліка адкрыта да ўсяго свету, мы вялікую ўвагу ўдзяляем менавіта Беларусі. Сёння мы прыехалі ў Мінск з чатырма канкрэтнымі прапановамі. Адна з іх датычыцца сумеснай дзейнасці паміж ВНУ нашых краін: Іжэўскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт і Беларуска-Расійскі ўніверсітэт падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве ў сферы адукацыі.

Таксама прыехалі адказныя асобы прадпрыемстваў, якія ўзаемадзейнічаюць у галіне вытворчасці і прамысловасці. У прыватнасці, Сарапульскі электрагенератарны завод і беларускае прадпрыемства «Амкадор» падпісваюць пагадненне ў галіне сумеснай вытворчасці электрацялежак.

Наша мясцовая кампанія «Руская» і «Магатэкс», найбуйнейшы вытворца тэкстыльнай прадукцыі ў Беларусі, падпісваюць вынікові дакумент аб сумеснай вытворчасці негаручых тканін. Таксама ў нас ёсць праект ад кампаніі «Гідрасістэмы» і завода з Барысава, які прадугледжвае абмен распрацоўкамі ў галіне абслугоўвання радыёэлектроннага абсталявання.

**— Чаму менавіта Беларусь абраная для больш цеснага супрацоўніцтва?**

— Па-першае, таму што тут існуе мінімальная колькасць рэгулятарных бар'ераў. Мы разумеем, што паміж нашымі краінамі практычна адсутнічае мытня, у нас падобныя менталітэт, галіны прамысловасці, што дае нам магчымасці для сумеснай працы.

**— Якая асноўная задача ўдзелу ў Форуме рэгіёнаў?**

— Галоўнай мэтай нашага чарговага візіту ў Беларусь стала наведванне Форуму рэгіёнаў. Плануем наша выступленне на секцыі лічбавай эканомікі. І гэта не дзіўна, таму што ў нас вельмі моцны IT-кластар. Акрамя гэтага, мы маем намер правесці сустрэчы з міністэрствамі прамысловасці, аховы здароўя і сельскай гаспадаркі, таму што па кожнай з гэтых галін ёсць канкрэтныя праекты, якія трэба абмеркаваць разам. Напрыклад, праект ільнаводства ў нашай рэспубліцы і перапрацоўкі лёну.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# З Глыбокага да пушкінскіх мясцін

**Напярэдадні форуму рэгіёнаў старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ расказаў «МС», які вопыт супрацоўніцтва напрацаваны з рэгіёнамі Расіі ў розных кірунках.**

— Нядаўна адпаведны дакумент падпісаны паміж Глыбоцкімі райсаветам, выканкамам і мясцовай уладай Вялікага Болдзіна Ніжагародскай вобласці, — паведаміў суразмоўнік.

Дарэчы, Вялікае Болдзіна і прылеглыя землі на працягу чатырох стагоддзяў належалі роду Пушкіных — аднаму з самых старажытных дваранскіх родаў Расіі. Цяпер гістарычная частка сяла з'яўляецца помнікам культуры федэральнага значэння. А беларускае Глыбокае, як вядома, — адзін з папулярных райцэнтраў, куды прыязджае шмат турыстаў. Безумоўна, калі стварыць адпаведны маршрут, гэта будзе працаваць на эканоміку двух рэгіёнаў.

— Акрамя гэтага, зараз прапрацоўваецца пытанне заключэння дагавора паміж Віцебскім абласным Саветам дэпутатаў і Заканадаўчым сходам Рэспублікі Карэлія. Асабліва плённа супрацоўнічаем з Пскоўшчынай: практычна ўсе раёны Прыдзвіння супрацоўнічаюць згодна з раней падпісанымі дагаворамі. У найбліжэйшы час плануецца дакумент падпісаць на аналагічным узроўні прадстаўнічай улады двух абласцей. У Пскове ў складзе дэлегацыі з Віцебшчыны былі і дэпутаты абласнога Савета, кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый, якія дамовіліся аб экспарце нашай прадукцыі.

Яшчэ ёсць эфект ад супрацоўніцтва з Цвярской вобласцю. Там наша «малочка» і іншыя тавары таксама вельмі запатрабаваныя і карыстаюцца добрым попытам. Гэта — вынік рэальнай працы дэпутацкага корпуса на эканоміку, — дадаў Уладзімір Цярэнцьеў.

Як паведамілі ў аблвыканкаме, на тэрыторыі Прыдзвіння зарэгістравана больш за 310 арганізацый з удзелам расійскага капіталу.

Напрыклад, ажыццяўляецца вытворчасць ветэрынарных прэпаратаў, труб, звадканага газу. Вырабляюцца таксама аптычны кабель, нестандартныя металаканструкцыі, абутак і гэтак далей.

> Гістарычная частка Вялікага Болдзіна з'яўляецца помнікам культуры федэральнага значэння. А беларускае Глыбокае — адзін з папулярных райцэнтраў, куды прыязджае шмат турыстаў. Калі стварыць агульны маршрут — гэта будзе працаваць на эканоміку двух рэгіёнаў.

Дзякуючы ўдзелу расійскага капіталу рэалізуецца цэлы шэраг праектаў. У свой час была выкуплена частка акцый віцебскага прадпрыемства, дзе вырабляюць кандэнсатары і электронных кампанентаў. А ў Лёзненскім раёне расіяне набылі нерухомасць для арганізацыі лагістычнага склада па транспарціроўцы солі. У Верхнядзвінскім раёне вырабляюць мяккія сыры тыпу «Мацарэла», «Адыгейскі». А яшчэ ў Аршанскім раёне зарэгістраваны новыя прадпрыемствы па транспарціроўцы звадкаванага газу.

Аснову закупак па імпарце складаюць мінеральная сыравіна, а таксама палімерная, тэкстыльная сыравіна, металавырабы, драўніна. У Расіі закупляецца абсталяванне, якое ўжываецца для рэалізацыі інвестыцыйных праектаў у энергетыцы, нафтахіміі, будаўнічай галіне, радыёэлектроніцы.

У сваю чаргу, у Расійскую Федэрацыю экспартуецца палова спажывецкіх тавараў, вырабленых на Віцебшчыне: больш за 450 найменняў. Заўсёды, напрыклад, запатрабаваныя мяса-малочная прадукцыя, абутак, упаковачныя і будаўнічыя матэрыялы, вырабы хімічнай прамысловасці.

Дарэчы, арганізацыі канцэрна «Мяса-малочныя прадукты», ААТ «Віцебская бройлерная фабрыка», дзяржаўнага аб'яднання «Віцебскпрам» маюць у Расіі свае гандлёвыя дамы, сумесныя прадпрыемствы. Праз іх ажыццяўляецца рэалізацыя прадукцыі ў найбольш блізкія рэгіёны: Смаленскую, Пскоўскую, Маскоўскую вобласці, Санкт-Пецярбург, Маскву. Пры гэтым рэалізацыя тавараў праводзіцца цэнтралізавана з улікам інтарэсаў малочных і мясных прадпрыемстваў.

Ёсць адпаведныя прадстаўніцтвы і ў камерцыйных структурах. Эфектыўнасць іх дзейнасці пацвярджаецца адсутнасцю пратэрмінаванай знешняй дэбіторскай запазычанасці.

У агульным аб'ёме тавараабароту вобласці ўдзельная вага Расіі летась склала каля 60 %, у тым ліку ў экспарце — 43,7 %, у імпарце — 74,4 %.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ДОЎГАТЭРМІНОВАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

**Расійская Федэрацыя — асноўны гандлёвы партнёр Міншчыны: яе ўдзельная вага ў агульным тавараабароце сёлета па выніках першага паўгоддзя склала амаль 40 %.**



Фота БелТА.

Асаблівасцю экспартных аперацый Мінскай вобласці з Расійскай Федэрацыяй з'яўляецца значная ўдзельная вага паставак харчовых тавараў. На іх долю прыходзіцца 28,7 %, або 505,5 мільёна долараў. Сыры, тварог, мяса птушкі — асноўныя пазіцыі экспарту. З Расіі завозяцца прадукты перапрацоўкі нафты, рухавікі і электрычныя генератары, неапрацаваны алюміній, мінеральныя і хімічныя ўгнаенні, якія ўтрымліваюць два або тры элементы сілкавання, сыравіна і матэрыялы для прамысловай вытворчасці.

Пры гэтым найбольш важнымі з'яўляюцца пытанні прамысловай кааперацыі, паставак харчавання, сельскагаспадарчай прадукцыі, узаемадзеяння ў прамысловым комплексе, а таксама свабода перамяшчэння і транзіту тавараў, падкрэслілі ва ўпраўленні знешнеэканамічных сувязяў камітэта па эканоміцы Мінаблвыканкама.

Ва ўзаемавыгадных сувязях з расійскімі рэгіёнамі ўдзельнічаюць суб'екты гаспадарання Міншчыны ўсіх формаў уласнасці. Напрыклад, летась у гэтую краіну ажыццяўлялі экспарт 1400 прадпрыемстваў. У ліку асноўных экспарцёраў — адкрытае акцыянернае таварыства «БелАЗ — упраўляючая кампанія холдынга «БелАЗ-холдынг», закрытае акцыянернае таварыства «Штадлер Мінск», сумесное таварыства з абмежаванай адказнасцю «Алюмінтэхна», таварыства з абмежаванай адказнасцю «Алютэх Варотныя Сістэмы», адкрытыя акцыянерныя таварыствы «Слуцкі сыраробны камбінат», «Смалявічы — бройлер», прадпрыемствы мясамалпрама.

На папярэднім Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі суб'ектамі гаспадарання сталічнай вобласці былі заключаны кантракты на суму больш за 160 мільёнаў долараў. У межах падрыхтоўкі да V Форуму ўжо былі заключаны кантракты на суму 175,6 мільёна долараў. І гэта не канчатковая лічба, паколькі яшчэ будуць улічаны кантракты, заключэнне якіх запланавана ў кастрычніку (усяго каля 200 дагавораў, у тым ліку БелАЗам на суму больш як 90 мільёнаў долараў.

Дарэчы, Мінскай вобласцю заключана 40 пагадненняў (дагавораў) аб супрацоўніцтве з рэгіёнамі Расіі, што дазваляе ажыццяўляць узаемадзеянне на доўгатэрміновай аснове. Дзейнічае таксама 99 пагадненняў аб супрацоўніцтве паміж раёнамі і горадам Жодзіна і адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі Расійскай Федэрацыі, прадстаўнікамі вышэйшых і мясцовых органаў улады двух краін.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

**ДА ТЭМЫ**

**Наталля ЯКУБІЦКАЯ, старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў:**



— Дагавор аб супрацоўніцтве заключаны паміж заканадаўчым сходам Ленінградскай вобласці і Мінскім абласным Саветам дэпутатаў. Мы запрашалі калег прыняць удзел у форуме. Але яны не змогуць прыехаць з аб'ектыўных прычын. У планах — заключэнне такога ж пагаднення са Свярдлоўскім заканадаўчым сходам. Пытанне яшчэ прапрацоўваецца, паколькі, як кажуць, з наскоку такія дакументы не прымаюцца. У пачатку наступнага года ў Мінскую вобласць чакаецца візіт губернатара Свярдлоўскай вобласці, у межах якога плануем падпісаць адпаведны дагавор.

ДАМОВА

# СТАЦЬ БЛІЖЭЙ ДА ЗОР

## Пагадненне аб супрацоўніцтве заключана паміж Зорным гарадком і Брэсцкім раёнам

**Пасля XXXI міжнароднага кангрэса Асацыяцыі ўдзельнікаў касмічных палётаў яго ўдзельнікі наведалі некаторыя рэгіёны нашай краіны. Сустракалі дэлегацыю касманаўтаў і ў Тамашоўцы Брэсцкага раёна, якая з'яўляецца малой радзімай першага беларускага касманаўта двойчы Героя Савецкага Саюза Пятра Клімука.**

У музеі касманаўтыкі мясцовай сярэдняй школы быў падпісаны дагавор аб супрацоўніцтве паміж Брэсцкім раёнам і Зорным гарадком Маскоўскай вобласці. Ініцыятыва мерапрыемстваў па збліжэнні двух рэгіёнаў належала Пятру Клімуку. **Старшыня Брэсцкага райвыканкама Уладзімір СЯНЧУК** назваў прынятае пагадненне рамачным. Гэта значыць, што ў працэсе работы яно будзе пашырацца і знаходзіць розныя кірункі для ўзаемадзеяння. І пачнецца сумесная работа з галін адукацыі і культуры.

Бакі бяруць абавязацельствы падтрымліваць партнёрства школ. Дэлегацыі работнікаў адукацыі змогуць абменьвацца вопытам работы, а групы вучняў будуць прыязджаць на экскурсіі, каб пашыраць свой кругагляд. Прадугледжаны таксама сумесныя семінары для навукоўцаў. Ключавым прыярытэтам супрацоўніцтва ў галіне навукі і адукацыі вызначаны касманаўтыка і машынабудаванне.

Цэлы раздзел дагавора прысвечаны абавязацельствам наладжвання супрацоўніцтва і абмену вопытам паміж органамі мясцовага самакіравання, грамадзянскімі інстытутамі. Вялікая ўвага ўдзяляецца культурнаму супрацоўніцтву. Бакі выказалі спадзяванне, што работа, якая распачнецца па гуманітарным кірунку, прывядзе да больш маштабнага — эканамічнага супрацоўніцтва.

Як паведаміў **намеснік старшыні Брэсцкага райвыканкама Павел ВАЛЫНЕЦ**, самай першай справай на шляху супрацоўніцтва стане абнаўленне экспазіцыі музея ў Тамашоўцы. Музей цікавы, першы такога тыпу ў нашай краіне, але асноўныя яго экспанаты ілюструюць касмічную галіну 80—90-х гадоў. Цяпер многае памянялася, існуе патрэба дадаць у экспазіцыю інтэрактыву. Што і паабяцалі зрабіць маскоўскія партнёры. А яшчэ налета запланаваны візіт дэлегацыі Брэстчыны ў Зорны гарадок. Там і будзе вызначаны графік паездак дзяцей на экскурсіі ў Зорны.

«А ў будучыні спадзяёмся на абмен вопытам паміж нашымі органамі самакіравання і Зорным. Ён з'яўляецца ўнікальнай адміністрацыйнай адзінкай, там ёсць і свой Савет дэпутатаў», — дадаў Павел Валынец.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# АД ІМІДЖУ ДА МІЛЬЁННЫХ ДАМОЎ

## Еўрарэгіён «Нёман» спрыяе сувязям Беларусі і Расіі

**Паспяховы вопыт рэгіянальнага супрацоўніцтва ў розных сферах паміж краінамі-суседкамі прадэманстраваны падчас міжнароднага бізнес-форуму «Еўрарэгіён «Нёман» — 2018», які 10-ы раз прайшоў у Гродне.**



Абласны выканаўчы камітэт, адміністрацыі прыгранічных рэгіёнаў Польшчы, Літвы, Расіі вось ужо 21 год развіваюць супрацоўніцтва ў рамках Еўрарэгіёна «Нёман». Пагадненне аб стварэнні трансгранічнага саюза было падпісана ў 1997 годзе ў польскім Аўгустове. Паступова яго межы пашыраліся, далучаліся новыя тэрыторыі. З 2002 года ў склад Еўрарэгіёна ўваходзяць раёны Калінінградскай вобласці Расіі.

Гэта паспрыяла наладжванню сувязяў паміж абласцямі. Не так даўно Калінінград наведала дэлегацыя, у склад якой увайшлі прадстаўнікі прадпрыемстваў Воранаўскага, Лідскага, Мастоўскага, Гродзенскага раёнаў. У выніку падпісаны дагавор аб арганізацыі паставак у расійскі рэгіён сельскагаспадарчай тэхнікі, а гродзенскія будаўнікі плануюць узвесці шматпавярховы дом. Таксама расіяне маюць намер падпісаць кантракт на будаўніцтва малочнатаварнай фермы і сховішча для агародніны. Сваю прадукцыю ў расійскі рэгіён сталі адпраўляць Гродзенская агароднінная фабрыка і кампанія «Красносельскбудматэрыялы».

Між іншым, на Гродзеншчыне працуе каля 200 прадпрыемстваў з расійскім капіталам. Самы буйны праект інвестыцыйнага супрацоўніцтва — узвядзенне атамнай станцыі ў Астраўцы.

Сёлета да бізнес-колаў Еўрарэгіёна далучыліся іншыя рэгіёны Расіі. Удзел у рабоце форуму прынялі прадстаўнікі адміністрацыі Ніжагародскай вобласці. Яны высока ацанілі прадукцыю гродзенскай кампаніі «Малочны свет», якая ідзе на расійскі рынак. На думку прадстаўнікоў Расійскай Федэрацыі, варта зрабіць наступны крок і стварыць сумесныя прадпрыемствы. Гэта стане не толькі добрым прыкладам інтэграцыі паміж абласцямі, але і замацуе супрацоўніцтва, выведзе яго на новы ўзровень. Па заканчэнні дыскусіі было падпісана каля двух дзясяткаў пагадненняў, мемарандумаў і кантрактаў з новымі партнёрамі з Расійскай Федэрацыі, Польшчы, Літвы, Чэхіі і Кітая.

— Гэта не толькі іміджавы праект. На форуме падпісаны буйны кантракт па будаўніцтве мэблевага прадпрыемства на Гродзеншчыне, падпісана пагадненне аб пачатку вытворчасці бавоўнянай пражы, а таксама дагавор у сферы лагістыкі. Гэта будзе садзейнічаць прыцягненню ў рэгіён звыш 120 мільёнаў долараў, — падкрэсліў **начальнік упраўлення эканомікі аблвыканкама Андрэй СВІРЫДАЎ.** — Таксама падпісаны трансгранічныя кантракты на 5 мільёнаў еўра, якія будуць рэалізаваны ў наступныя два гады. Яшчэ 20 мільёнаў долараў складаюць камерцыйныя кантракты, з якімі прадпрыемствы Гродзенскай вобласці выйдуць на экспартныя пастаўкі.

Еўрарэгіён стаў добрай пляцоўкай і для сельгасвытворцаў. Гродзенцы актыўна супрацоўнічаюць менавіта з расійскімі рэгіёнамі. Па словах **старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні аблвыканкама Валерыя ХЕЛСКАГА,** больш за 80 % вырабляемай сельгаспрадукцыі экспартуецца на расійскі рынак. Ад гэтага залежыць і работа гродзенскіх прадпрыемстваў, якія імкнуцца знайсці партнёраў. І вынік ёсць. Заключаны дагавор на пастаўку крухмалу Рагозніцкім заводам на суму больш за 2 мільёны рублёў.

Значны эканамічны эфект можна атрымаць і ад турызму. Гэты кірунак развіваюць усе краіны — удзельніцы Еўрарэгіёна. Са з'яўленнем бязвізавага рэжыму значны рух адчувае і Гродзенскі рэгіён, і, як вынік, — колькасць турыстаў за гэты час склала больш за 120 тысяч чалавек. А калі ўлічваць, што кожны турыст пакідае ў сярэднім 100—120 долараў, можна падлічыць эканамічны эфект.

— Кожны месяц мы прырастаем у дынаміцы на 25—30 % у параўнанні з мінулым годам, — паведаміў **начальнік упраўлення спорту і турызму аблвыканкама Алег АНДРЭЙЧЫК.** — За гэты час створана звыш 500 новых працоўных месцаў, уведзена 20 аб'ектаў грамадскага харчавання, актывізаваўся малы і сярэдні бізнес. Далейшае развіццё мы бачым у пашырэнні бязвізавай зоны ў кірунку турыстычнай «меккі» — Навагрудка, Міра, Ліды, Слоніма. Наогул, варта зрабіць увесь Гродзенскі рэгіён бязвізавым.

Важная роля ў рэгіянальным супрацоўніцтве надаецца малому і сярэдняму бізнесу. Гэта асяроддзе таксама з'яўляецца эфектыўным інструментам развіцця рэгіёнаў. Па стане прадпрымальніцтва Гродзеншчына займае лідарскія пазіцыі ў краіне, адзначыў **дырэктар абласной установы фінансавай падтрымкі прадпрыймальнікаў Аляксандр ПАНАМАРОЎ.**

Прыгадалі і праекты, якія былі заяўлены на папярэднім форуме і зараз паспяхова рэалізуюцца. У іх ліку — будаўніцтва буйнога лагістычнага цэнтра ў Смаргоні прыватным расійскім інвестарам.

Форум дае магчымасці будаўнічай галіне пашырыць экспарт паслуг і будаўнічых матэрыялаў, адзначыў **старшыня камітэта па архітэктуры і будаўніцтве аблвыканкама Міхаіл ПЕТУХ.** За восем месяцаў аб'ём экспарту паслуг склаў 73 мільёны долараў. Гэта больш, чым летась. Будматэрыялы пастаўляюцца ва ўсе краіны Еўрарэгіёна і за яго межы. Гродзенскія будаўнікі ўзводзяць жылыя мікрараёны ў Маскоўскай вобласці і Калузе Расійскай Федэрацыі. Вядуцца перагаворы па заключэнні кантракта на выкананне будаўніча-мантажных работ на прамысловым аб'екце ў Калінінградзе.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# КАНТАКТЫ ПРЫЦЯГНУЦЬ КАНТРАКТЫ

## Двухбаковыя перамовы, праведзеныя падчас Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, даюць імпульс развіццю ўзаемаадносін

Дарэчы, паміж Гомельскай вобласцю і расійскімі рэгіёнамі складзена 24 двухбаковыя і тры шматбаковыя дагаворы аб гандлёва-эканамічным і навукова-культурным супрацоўніцтве. 73 дагаворы аб партнёрскіх і пабрацімскіх сувязях рэалізуюцца гарадамі і раёнамі Гомельшчыны з адпаведнымі адміністрацыйнымі расійскімі адзінкамі.

Між тым, расказала **начальнік упраўлення знешнеэканамічных сувязяў камітэта эканомікі Гомельскага аблвыканкама Аляўціна САРАНЧУК**, Расійская Федэрацыя застаецца для Гомельскай вобласці асноўным партнёрам.

— За сем месяцаў 2018 года яе ўдзельная вага ў знешнегандлёвым тавараабароце склала 63 %. Асноўныя прадпрыемствы, якія пастаўляюць сваю прадукцыю на экспарт: Беларускі металургічны і Рэчыцкі метызны заводы, «Гомсельмаш», «Гомельшкло», «Светлагорскхімвалакно». Нам пастаўляюць галоўным чынам сыравіну, якая забяспечвае загружанасць прадпрыемстваў: нафту, чорныя металы, прыродныя фасфаты, звадкаваныя газы, поліпрапілен і прамысловае абсталяванне.

У інвестыцыйным кірунку назіраюцца ўзаемавыгадныя тэндэнцыі. На тэрыторыі Гомельскай вобласці працуе больш за 400 прадпрыемстваў з расійскім капіталам, у тым ліку 18 з іх з'яўляюцца рэзідэнтамі СЭЗ «Гомель-Ратон». Сёлета зарэгістраваны тры новыя рэзідэнты з расійскім капіталам — прадпрыемствы па вытворчасці бытавой тэхнікі, маламесных аўтобусаў, прыбораў уліку энергарэсурсаў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже права заключения договора аренды земельного участка

**Организатор аукциона:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 47-20-46.

| Предмет аукциона, кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, срок аренды, размер начальной цены и задатка |
|---|
| Лот № 1. Право на заключение договора аренды сроком на 10 лет земельного участка с кадастровым № 224650100003000472, расположенного по адресу: Витебская обл., Толочинский р-н, г. Толочин, ул. Ленина, площадью 0,0036 га для установки торгового павильона (назначение: земельный участок для размещения объектов розничной торговли). Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: отсутствуют. **Нач. цена:** 107,92 бел. руб. **Задаток:** 10,79 бел. руб. |
| Дата, время и место проведения аукциона: 13.11.2018 по адресу: г. Толочин, ул. Ленина, 1, в Толочинском райисполкоме. Срок внесения задатка и подачи документов: с 12.10.2018 с 8.30 по 12.11.2018 до 17.30. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY84AKBB36003270095710000000 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа – 04002. Получатель платежа: ГУ МФ по Витебской области (Толочинский райисполком) |
| **Условия аукциона:** победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола аукциона либо протокола признания аукциона несостоявшимся внести плату за право заключения договора аренды зем. участка и возместить расходы, связанные с проведением аукциона и подготовкой документации, необходимой для его проведения; не позднее двух рабочих дней после внесения денежных выплат и выполнения условий, указанных в протоколе аукциона либо в протоколе признания аукциона несостоявшимся, заключить с Толочинским райисполкомом договор аренды земельного участка; в течение двух месяцев со дня заключения договора аренды земельного участка обратиться за гос. регистрацией права на земельный участок в Толочинское бюро Оршанского филиала республиканского унитарного предприятия «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; по окончании срока аренды зем. участка совместно с Толочинским райисполкомом в установленном порядке решить вопрос его дальнейшего использования; получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и тех. условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства (установки), разрешения на проведение проектно-изыскательских работ, разработку строительного проекта на строительство (установку) торгового павильона в срок, не превышающий 2 лет; приступить к строительству (установке) торгового павильона в течение 6 месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство и завершить строительство (установку) торгового павильона в сроки, определенные проектной документации |

| Предмет аукциона, кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, срок аренды |
|---|
| Лот № 1. Право заключения договора аренды сроком на 50 лет земельного участка с кадастровым № 223055100001002421 площадью 0,1341 га по адресу: Витебская обл., Лиозненский р-н, г. п. Лиозно, ул. Димитрова, 3, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона водного объекта (пруд). **Нач. цена**: 2 363,10 бел. руб. **Задаток:** 236,31 бел.руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY46-AKBB36003200020090000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04002. Получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Лиозненский райисполком) |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 15.11.2018 в 12.00 по адресу: Витебская обл., г. п. Лиозно, ул. Ленина, 79/2, в Лиозненском районном исполнительном комитете. Срок внесения задатков и приема документов: с 12.10.2018 с 8.30 по 14.11.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в рабочие дни с 8.30 до 17.30 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Условия аукциона:** победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола аукциона либо протокола признания аукциона несостоявшимся внести плату за право заключения договора аренды зем. участка и возместить расходы, связанные с проведением аукциона и подготовкой документации, необходимой для его проведения; осуществить государственную регистрацию права на земельный участок в двухмесячный срок со дня утверждения протокола аукциона; приступить к занятию зем. участка в течение 1 года со дня гос. регистрации создания зем. участка и возникновения права на него в соответствии с целью и условиями его предоставления; в установленные законодательством сроки получить в отделе архитектуры и строительства Лиозненского райисполкома архитектурно-планировочное задание и тех. условия на инженерно-техническое обеспечение объекта строительства; разработать и утвердить в установленном законодательством порядке проектно-сметную документацию на строительство объекта; приступить к строительству объекта после разработки и утверждения в установленном порядке строительного проекта и получения разрешения на производство строительно-монтажных работ; после получения разрешения на производство строительно-монтажных работ снять на занимаемом участке плодородный слой почвы и использовать его для нужд, связанных со строительством объекта; осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией |

Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Для участия в аукционе приглашаются граждане, индивидуальные предприниматели, юр. лица, консолидированные участники (двое и более граждан, индивидуальных предпринимателей, юр. лиц). Для участия в аукционе граждане, индивидуальные предприниматели, консолидированные участники и юр. лица (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный срок подают заявление на участие в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, с отметкой банка, заключают соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр. лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; представителем иностранного юр. лица – легализованные копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык, легализованные доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о фин. состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного гражданина – легализованная доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; консолидированными участниками представляются оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов предъявляется документ, удостоверяющий личность. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Контактные тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.



*Настоящим ООО «Толми-Бел» уведомляет о том, что 09.10.2018 года на заседании внеочередного общего собрания участников Общества принято решение о начале процесса реорганизации* ***ООО «Толми-Бел» в форме присоединения его к ООО «Белинтерпродукт»*** *(зарегистрированное в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за номером 100344432, юридический адрес: 220024, г. Минск, ул. Кижеватова, д. 72, корп. 1, к. 3), с последующей передачей последнему всех прав, обязанностей и имущества ООО «Толми-Бел».*

Требования кредиторов могут быть предъявлены письменно в течение 30 (тридцати) дней от даты публикации настоящего уведомления по следующему адресу: 220088, г. Минск, ул. Смоленская, 25 (5-й этаж, приемная).

УНП 191129542

# Каго шукаюць у Гродне?

## Патрэбны кіроўцы, гандляры і выхавальнікі

**Сітуацыя на рынку працы стабілізуецца, лічаць спецыялісты, і ў якасці доказаў прыводзяць такія вызначальныя фактары, як устойлівая дэмаграфічная сітуацыя, павелічэнне колькасці працаздольных грамадзян, замаруджванне працэсу аптымізацыі персаналу арганізацыямі горада, павелічэнне попыту на рабочую сілу ў абласным цэнтры ды іншыя. «МС» пацікавілася падрабязнасцямі.**

### Хто дзе працуе?

У пачатку 2018 года колькасць гараджан складала 370,9 тысячы чалавек. Па выніках трэцяга квартала, у эканоміцы былі занятыя 168,9 тысячы гродзенцаў. У прамысловасці працуюць 33,7 тысячы, амаль столькі ж занята ў сферах адукацыі і аховы здароўя — 32,2 тысячы чалавек. У сферах будоўлі і гандлю задзейнічана больш за 10 работнікаў у кожнай.

Як паведаміла **начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гродзенскага гарвыканкама Лілія САНЮКЕВІЧ** падчас сесіі гарсавета дэпутатаў, сітуацыя на рэгіструемым рынку працы ў Гродне сёлета характарызуецца зніжэннем у параўнанні з мінулым годам рэгістрацыі беспрацоўных гараджан, а таксама высокім попытам на працоўную сілу.

### Колькасць беспрацоўных зніжаецца

Так, за дзевяць месяцаў бягучага года па садзейнічанне ў працаўладкаванні ва ўпраўленне звярнулася 6225 грамадзян, зарэгістраваны беспрацоўнымі 3813 чалавек. А цяпер параўнаем лічбы таго ж перыяду, але ў мінулым годзе: 7303 (больш на 1078) і 4908 (больш на 1095) чалавек адпаведна. З улікам тых, хто ўжо стаяў на ўліку раней, на пачатак года ў працаўладкаванні мелі патрэбу 7337 гродзенцаў, што менш на 2137 чалавек, чым летась. А гэта мінус 22,6 % ад леташняй лічбы.

— У рабоце па садзейнічанні занятасці насельніцтва асаблівая ўвага ўдзяляецца забеспячэнню занятасці сацыяльна ўразлівых грамадзян — інвалідаў, бацькоў у няпоўных і шматдзетных сем'ях, моладзі ва ўзросце да 21 года, што ўпершыню шукае сабе месца працы, гараджане перадпенсійнага ўзросту ды іншыя, — адзначыла Лілія Санюкевіч. — У структуры рэгіструемых беспрацоўных яны складаюць 20 %.

Узровень працаўладкавання такой катэгорыі грамадзян за гэты час склаў больш за 53 %, што зноў такі значна вышэй за леташні паказчык.

### Попыт на рабочую сілу расце

А цяпер аб самым галоўным. Узровень рэгіструемага беспрацоўя па звестках на 1 верасня складаў 0,4 % да колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва. Параўноўваючы гэты паказчык з мінулагоднім, адзначым, што тады ён складаў 0,7 %. Каэфіцыент напружанасці знізіўся да 0,2 беспрацоўнага на вакансію, а раней было — 0,6.

Дарэчы, летась з'явілася тэндэнцыя, якая і сёлета працягвае ўкараняцца, — павелічэнне попыту на рабочую сілу на рынку працы ў горадзе. Заяўленная патрэба гарадскіх арганізацый у кадрах на 1 верасня складала 2752 вакансіі, калі на пачатак 2017 года іх было 1330.

— Адначасова з ростам попыту на рабочую сілу і змяншэннем колькасці саіскальнікаў працы назіраецца абвастрэнне пытання забеспячэння кадрамі прадпрыемстваў па асобных прафесіях, — звярнула ўвагу выступоўца.

Дык якія ж спецыялісты ў дэфіцыце? Сёння вельмі патрэбны кіроўцы аўтамабіляў, швачкі, кухары, прадаўцы, слесары па рамонце і абслугоўванні абсталявання, электрыкі, кваліфікаваныя рабочыя-будаўнікі, сярэдні медперсанал, выхавальнікі дзіцячых садкоў, інжынеры. Прагляд вакансій у Гродне, змешчаных у адкрытым доступе, паказаў, што самую прывабную зарплату з гэтага спіса прапануюць кіроўцам-міжнароднікам — ад тысячы рублёў і болей. Але вакансіі ўсё роўна не запаўняюцца... Чаму?

— Адным з фактараў дэфіцыту кадраў на рынку працы горада з'яўляецца адток кадраў у суседнія Польшчу і Літву, — растлумачыла Лілія Санюкевіч.

Дзеля інфармавання гараджан аб магчымасцях працаўладкавання ў сваім горадзе прымаюцца розныя захады: упраўленне, напрыклад, шырока практыкуе правядзенне «Кірмашоў вакансій», «Дзён прадпрыемстваў», «Тыдняў перасялення» і мерапрыемстваў «Пачні сваю справу». Свой эфект гэта прыносіць, але як той казаў, няма межаў для дасканаласці...

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# «НЕЭТЫЧНА ЖЫЦЬ ЗА КОШТ ХВОРАЙ МАЦІ»,

## ці Як працуе пастаянная камісія па садзейнічанні занятасці насельніцтва на Лепельшчыне

**Дзеля рэалізацыі Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 3 «Аб садзейнічанні занятасці насельніцтва» ў раёне створана адмысловая камісія, якую ўзначальвае старшыня раённага Савета дэпутатаў Ігар УРБАН, піша «Лепельскі край».**

Перад членамі камісіі — непрацуючы жыхар адной з вёсак Лепельскага сельсавета Арцём. Апошнія месяца працы — філіял «Лепельскі» ААТ «Віцебскаграпрадукт». Стропальшчык — запатрабаваная прафесія, ёсць варыянт і перавучыцца. Пад ляжачы камень вада не бяжыць. Арцёму параілі не цягнуць час, а праглядаць вакансіі. У сваю чаргу члены камісіі будуць трымаць пытанне працаўладкавання Арцёма на кантролі.

... У лепельчаніна Віталя таксама нядрэнная прафесія — слесар-сантэхнік. У цяперашні момант даглядае хворую маці, аднак з афіцыйнай работы па доглядзе яго нядаўна звольнілі. У сям'і праблемы, маці часта тэлефануе ў міліцыю са скаргай, што сын не працуе. Адным словам, калі называць рэчы сваімі імёнамі, жыве на ўтрыманні ў састарэлай маці.

— На маю думку, не зусім этычна жыць за кошт хворай маці, — спрабуе дастукацца да мужчыны Ігар Урбан. — Бо можна звярнуцца ва ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне райвыканкама, дзе вам прапануюць вакансіі або магчымасць прайсці перанавучанне. Акрамя таго, нагадаю, што, згодна з Дэкрэтам № 1, з першага студзеня працаздольныя непрацуючыя грамадзяне будуць цалкам аплачваць субсідаваныя дзяржавай камунальныя паслугі. Так далей жыць нельга ні па этычных, ні па маральных нормах. Калі ёсць жаданне, працаваць вы будзеце заўсёды. У новай краме «Дыяніс», напрыклад, вісіць аб'ява аб вакансіі грузчыка. Чаму б не схадзіць туды і не пахадайнічаць за сябе, не спадзеючыся на кагосьці?

Да мяне і цяпер звяртаюцца з просьбай працаўладкаваць чалавека. Дапаможаш, а праз некаторы час з-за паводзін нядбайнага работніка сорамна кіраўнікам у вочы глядзець. Патэлефануем, паклапоцімся, але не больш як адзін раз. Прыходзьце са спісам неабходных дакументаў у цэнтр занятасці, а варыянт працаўладкавання заўсёды можна падабраць.

Станіславу, які жыве ў адной з вёсак Горскага сельсавета, крыху за пяцьдзясят. Пастаянныя скандалы ў сям'і з братам, які папракае Станіслава ва ўтрыманстве. Сітуацыя няпростая. Цяжкую працу мужчына па стане здароўя выконваць не можа, але няма сведчанняў і для афармлення інваліднасці. Зрэшты, па вонкавым выглядзе Станіслава лёгка выказаць здагадку, што здароўе было падарвана



lepel-kraj.by

ў сяброўстве з чаркай. У сваё «крыху за пяцьдзясят» выглядае на дзясятак гадоў старэйшым. Вясковец запэўніў, што апошнім часам з алкаголем «завязаў».

Члены камісіі паспрабуюць дапамагчы знайсці нескладаную работу. Для Станіслава ж выбар просты. Адновіць стасункі з алкаголем — з'едзе ў лячэбна-працоўны прафілакторый, калі не — усе шанцы выбрацца з багны.

У Аляксандра з вёскі Бароўскага сельсавета жыццёвая дарога таксама напоўнена ямамі і выбоінамі: злоўжыванне алкаголем, знаходжанне ў ЛПП, работа ў КУПП «Бароўка», звальненне па артыкуле. Як вынік — адсутнасць работы і «прысутнасць» вялікай запазычанасці за кватэру.

Лепельчанка Святлана ў свой час атрымала ад дзяржавы сацыяльную кватэру, бо мела статус сіраты. Здавалася б, жыві і радуйся. Праўда, затым з-за няўплаты камунальных паслуг выгоды былі адключаныя. Аднак на камісіі жанчына запэўнівала, што з запазычанасцю расплацілася і зрабіла рамонт. На апошнім месцы працы замяшчала прыбіральшчыцу на час адпачынку. Святлана ведае швейную справу і ўладкавацца пры жаданні можна. Ёсць і магчымасць прайсці перанавучанне. Адна праблема — біць лынды не атрымаецца. Зрэшты, жаданне працаваць у вачах Святланы чыталася даволі выразнае, а гэта — галоўны аргумент на яе карысць.

Анатолю, жыхару адной з вёсак Лепельскага сельсавета, у хуткім часе споўніцца шэсцьдзесят. Яго было шчыра шкада: працавіты мужчына са стажам больш за сорак гадоў трапіў у няпростую жыццёвую сітуацыю. Выплаты па трэцяй групе інваліднасці невялікія, трэба работу шукаць. Яму прапанавалі падысці ў цэнтр занятасці.

— Работа з асацыяльнымі элементамі ў раёне арганізавана на належным узроўні, — упэўнены Ігар Урбан. — Цесная сувязь існуе паміж прадстаўнікамі гарадскіх і сельскіх пунктаў аховы грамадскага правапарадку, упраўленнем па працы, занятасці і сацыяльнай абароне райвыканкама. Тут важна памятаць, што ўсё залежыць ад чалавека. У нас няма самамэты змагацца з такімі людзьмі, мы змагаемся за тое, каб дапамагчы ім знайсці работу і змяніць жыццё да лепшага.

**Падрыхтавала Вольга АНУФРЫЕВА.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 11 кастрычніка 2018 года.**